Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”
Кафедра беларускага мовазнаўства

В.Э. Зіманскі

ПАРАЎНАЛЬНАЯ ГРАМАТЫКА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ МОЎ

Курс лекцый

У 2 ЧАСТКАХ

Частка 1

Уводзіны. Лексіка. Фразеалогія. Фанетыка. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Графіка. Арфаграфія

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2013

Репозиторий ВГУ

УДК 811.161’36(075.8)
ББК 81.411-923.2
З-62

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 9 ад 20.06.2013 г.

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук **В.Э. Зіманскі**

Р э ц э н з е н т :
дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук *А.Ю. Муратава*

Зіманскі, В.Э.

З-62 Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў : курс лекцый : у 2 ч. / В.Э. Зіманскі. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – Ч. 1 : Уводзіны. Лексіка. Фразеалогія. Фанетыка. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Графіка. Арфаграфія. – 55 с.

У першай частцы курса лекцый змешчаны тэарэтычны матэрыял па наступных тэмах курса “Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў”, які вывучаецца студэнтамі факультэта беларускай філалогіі і культуры: “Уводзіны”, “Лексіка і фразеалогія”, “Фанетыка і арфаэпія”, “Графіка і арфаграфія”. Лекцыйны матэрыял суправаджаецца пытаннямі для самаправеркі і самакантролю.

Дадзенае вучэбнае выданне можа быць выкарыстана студэнтамі іншых філалагічных спецыяльнасцей, а таксама вучнямі сярэдніх школ, навучэнцамі гімназій і ліцэяў. Адрасавана ўсім, хто дбае пра павышэнне ўласнага культурнага ўзроўню.

УДК 811.161’36(075.8)
ББК 81.411-923.2

© Зіманскі В.Э., 2013
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013

Рэпозиторий ВГУ

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ……..... 4
ТЭМА 1. Уводзіны ……..... 5
ТЭМА 2. Лексіка-фразеалагічная сістэма ўсходнеславянскіх моў ... 12
ТЭМА 3. Фанетыка-арфаэпічная сістэма ўсходнеславянскіх моў … 23
ТЭМА 4. Графіка-арфаграфічная сістэма ўсходнеславянскіх моў ... 44
ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА ……..... 54

Репозиторий ВГУ

ПРАДМОВА

Курс «Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў» прызначаны для будучых настаўнікаў-філолагаў. Яго задачай з'яўляецца супастаўляльнае вывучэнне блізкароднасных рускай, украінскай і беларускай моў з тым, каб даць студэнтам канкрэтныя веды пра падабенства і адрозненне ў фанетычным, лексічным і граматычным ладзе супастаўленых моў. Параўнальнае вывучэнне ўсходнеславянскіх моў спрыяе больш глыбокаму асэнсаванню лінгвістычных з'яў, а ва ўмовах білінгвізму з'яўляецца асновай методыкі выкладання беларускай мовы ў нацыянальнай школе.

Як правіла, курс лекцый параўнальнай граматыкі ўключае ў сябе, акрамя параўнальнай марфалогіі і сінтаксісу, параўнальную лексікалогію, фразеалогію, фанетыку, арфаэпію, графіку, арфаграфію і разглядае агульнае і адрознае на сучасным этапе развіцця моў. Аднак, улічваючы блізкароднаснасць рускай, украінскай і беларускай моў, у працэсе выкладання неабходны экскурсы ў гісторыю ўсходнеславянскіх народаў і іх моў, што дазволіць растлумачыць прычыны падабенстваў і разыходжанняў.

Трэба адзначыць, што першая частка курса лекцый уключае якраз пытанні ўводзінаў, лексікі і фразеалогіі, фанетыкі, фаналогіі, арфаэпіі і акцэнтуацыі, графікі і арфаграфіі, такім чынам, прапанаваны матэрыял ахоплівае чатыры асноўныя тэмы курса з шасці. Колькасць лекцыйных заняткаў па кожнай тэме выкладчык выбірае асабіста, зыходзячы з вучэбнага плана, вучэбных праграм, дыдактычных мэт, агульнай колькасці адведзеных на вывучэнне курса аўдыторных гадзін, гадзін самастойнай працы і г.д.

Абмежаваны аб'ём выдання не дазваляе падрабязна спыняцца на пытаннях, дастаткова глыбока асветленых у сучаснай вучэбнай і навуковай літаратуры (гл. спіс літаратуры). Улічваючы тое, што вывучэнне рускай і беларускай моў абавязкова прадугледжана вучэбнымі планамі філалагічных факультэтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь, пры падборы матэрыялу большая ўвага ўдзелена асвятленню моўных аспектаў украінскай мовы для атрымання магчымасці параўнаць іх з адпаведнымі аспектамі рускай і беларускай моў.

Матэрыял курса разлічаны на 2 часткі. Тэарэтычны матэрыял, прапанаваны ў першай частцы, уключае ў сябе звесткі, узятыя з курсаў "Сучасная беларуская мова", "Сучасная руская мова", "Сучасная ўкраінская мова", "Гісторыя беларускай мовы", "Гісторыя рускай мовы", "Гісторыя ўкраінскай мовы", "Агульнае мовазнаўства", "Стараславянская мова", пададзеныя ў кампаратыўным і супастаўляльным аспектах і дапоўненыя пералікам тэарэтычных пытанняў і паняційным апаратам, неабходнымі для засваення праграмнага матэрыялу, і пашыраным спісам літаратуры.

Репозиторий БГУ

ТЭМА 1. Уводзіны

Пытанні

1. Параўнальная граматыка як навука. Змест, прадмет, задачы параўнальнай граматыкі.
2. Метады параўнальнай граматыкі.

Паняційны апарат: сінхранія, дыяхранія, кампаратывістыка, параўнанне, супастаўленне, параўнальна-гістарычны метад, сінхронна-супастаўляльны метад.

Літаратура

1. Абабурка, М.В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў / М.В. Абабарука. – Мінск, 1992.
2. Бернштейн, С.Б. Сравнительная грамматика славянских языков / С.Б. Бернштейн. – Москва, 2005.
3. Бирнбаум, Х. Праславянский язык: достижения и проблемы в его реконструкции / Х. Бирнбаум. – Москва, 1987.
4. Бордович, А.М. Сопоставительный курс русского и белорусского языков / А.М. Бордович, А.А. Гируцкий, Л.В. Чернышева. – Минск, 1999.
5. Булахаў, М.Г. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX–XX ст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі / М.Г. Булахаў. – Мінск, 1958.
6. Вежбицкая, А. Семантические универсалии и описание языков / А.Вержбицкая. – Москва, 1999.
7. Гаспаров, Б.М. Сравнительная грамматика славянских языков / Б.М. Гаспаров, П.С. Сигалов. – В 2 т. – Тарту, 1974.
8. Гируцкий, А.А. Белорусско-русский художественный билингвизм: типология и история, языковые процессы / А.А. Гируцкий. – Минск, 1990.
9. Ломтев, Т.П. Сравнительно-историческая грамматика восточнославянских языков / Т.П. Ломтев. – Москва, 1961.
10. Толстой, Н.И. История и структура славянских литературных языков / Н.И. Толстой. – Москва, 1988.
11. Филин, Ф.П. Происхождение русского, украинского и белорусского языков / Ф.П. Филин. – Ленинград, 1972.

1. Параўнальная граматыка як навука – гэта раздзел мовазнаўства, які, апіраючыся на законы развіцця мовы, праводзіць сістэмнае супастаўленне і параўнанне фактаў розных моў у сінхронным ці дыяхранічным плане. У залежнасці ад метаду, якім карыстаюцца мовазнаўцы пры параўнальным вывучэнні дзвюх ці некалькіх моў, параўнальная граматыка можа быць супастаўляльнай ці параўнальна-гістарычнай. Супастаўляльная граматыка грунтуецца на супастаўляльным метадзе вывучэння дзвюх ці некалькіх моў незалежна ад іх роднасных адносін, параўнальна-гістарычная – на параўнальна-гістарычным метадзе, якім карыстаюцца галоўным чынам для параўнання і гістарычнага аналізу роднасных моў і дыялектаў з мэтай рэканструкцыі дапісьмовага стану і эвалюцыі дзвюх ці некалькіх моў, структуры і генезісу агульнай для той ці

Репозиторий ВГУ

іншай групы прамовы (напрыклад, агульнаславянскай (праславянскай), агульнаўсходнеславянскай і інш.).

Параўнальная граматыка беларускай, рускай, украінскай моў заклікана не толькі ўзброіць веданнем агульных і спецыфічных асаблівасцей усходнеславянскіх моў, але і навучыць карыстацца параўнальна-гістарычным і супастаўляльным метадамі ў практычнай дзейнасці.

2. Прадмет, аб'ект, мэта і задачы параўнальнай граматыкі беларускай, рускай і ўкраінскай моў. Параўнальная граматыка як лінгвістычная дысцыпліна мае, акрамя адукацыйна-тэарэтычнага, і навучальна-практычнае значэнне: у працэсе вывучэння раскрываюцца асноўныя заканамернасці беларускай, рускай і ўкраінскай моў у іх узаемасувязі на ўсіх этапах развіцця, вызначаць агульныя і спецыфічныя з'явы ў мовах, асэнсоўваць прычыны існуючых адрозненняў;

Аб'ектам параўнальнай граматыкі з'яўляецца параўнальная характарыстыка агульных і спецыфічных асаблівасцей беларускай, рускай і ўкраінскай моў на ўсіх этапах іх развіцця. Зразумела, што для гэтай дысцыпліны ўсе славянскія мовы складаюць той фон, на якім больш яскрава выдзяляецца спецыфіка сучасных усходнеславянскіх моў.

Мэта выкладання дысцыпліны – параўнальнае вывучэнне лексічнага складу, фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу трох усходнеславянскіх моў – беларускай, рускай і ўкраінскай – на ўсіх этапах іх гістарычнага развіцця.

Задачы вывучэння дысцыпліны:

– раскрыць асноўныя заканамернасці развіцця ўсходнеславянскіх моў у іх узаемасувязі;

– паказаць агульныя рысы і растлумачыць спецыфічныя асаблівасці і адрозненні паміж беларускай, рускай і ўкраінскай мовамі;

– сістэматызаваць веды, набытыя студэнтамі-філолагамі пры вывучэнні ўсіх іншых лінгвістычных дысцыплін;

– навучыць будучых настаўнікаў заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі вучняў, у тым ліку выкліканыя моўнай сітуацыяй і праблемамі білінгвізму ў краіне.

Тэрмін "параўнальная граматыка" ўключае ў сябе не толькі тое, што можна назваць "параўнальная марфалогія" і "параўнальны сінтаксіс". Значэнне гэтага тэрміна трэба разумець больш шырока, таму што аб'ектам параўнальнай граматыкі як навучальнай дысцыпліны з'яўляецца таксама параўнальная лексікалогія, фразеалогія, фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія. Адсюль вынікае, што сувязь параўнальнай граматыкі з усімі раздзеламі мовазнаўства самая непасрэдная. Такія лінгвістычныя дысцыпліны, як "Сучасная беларуская літаратурная мова", "Сучасная руская літаратурная мова", "Гістарычная граматыка беларускай (рускай, украінскай) мовы", "Гісторыя беларускай (рускай, украінскай) літаратурнай мовы", "Уводзіны ў мовазнаўства", "Агульнае мовазнаўства" і інш., даюць той неабходны тэарэтычны матэрыял, які дазваляе адносіць параўнальную граматыку да шматпланавай дысцыпліны на філалагічных факультэтах.

3. Метады параўнальнай граматыкі. Агульнавядома, што метад – гэта спосаб пазнання або пераўтварэння рэчаіснасці. Параўнальна-гістарычны, ці кампаратыўны, метад – гэта сістэма навуковых прыёмаў, пры дапамозе якіх выяўляецца прырода роднасных ці няроднасных моў і іх састаўных элементаў,

Репозиторий ВГУ

тлумачыцца падабенства або адрозненне ў мовах адной сям'і, групы ці падгрупы, праводзіцца гісторыка-генетычнае параўнанне фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу дзвюх ці некалькіх роднасных моў, аднаўляюцца незафіксаваныя мінулыя моўныя факты шляхам іх супастаўлення з адпаведнымі, але больш познімі фактамі, вядомымі з пісьмовых помнікаў ці жывога выкарыстання ў супастаўляльных мовах. Карыстаючыся гэтым метадам, даследчыкі даведваюцца не толькі пра паходжанне той ці іншай мовы, яе лексікі і фанетыкі, марфалогіі і сінтаксісу, але і пра ўзаемаадносіны роднасных моў у ходзе іх гістарычнага развіцця, пра рысы іх агульнасці і адрознення, пра характар іх змен на ўсіх узроўнях і г.д.

Параўнальна-гістарычны метад складваўся на працягу амаль цэлага стагоддзя і стаў асновай параўнальна-гістарычнага мовазнаўства, у якім, безумоўна, выкарыстоўваліся і выкарыстоўваюцца як абавязковыя наступныя прыёмы:

- супастаўленне значымых адзінак мовы, асабліва гукаў і марфем, у роднасных мовах (прымяняюцца і пры доказе роднаснасці);
- устанаўленне заканамерных адпаведнасцей паміж супастаўляльнымі элементамі роднасных моў;
- устанаўленне пэўных храналагічных адносін паміж супастаўляльнымі элементамі (мовамі);
- лінгвістычная рэканструкцыя архетыпу (праформы);
- выяўленне заканамернасцей і прычын, што выклікалі страту зыходных (пачатковых) форм.

Дзякуючы гэтаму метаду кампаратывісты даказалі, што існавала агульнаіндаеўрапейская мова-аснова, або прамова, якая дзесьці ў III–II тысячагоддзях да н. э. распалася на асобныя мовы. Адтуль бярэ свой пачатак і праславянская мова, якая праіснавала як адзіная мова славян амаль да VII ст. н.э., пакуль у сваю чаргу не раздзялілася на паўднёваславянскую, заходнеславянскую і ўсходнеславянскую. Апошняя дала магчымасць сфарміравацца на яе аснове мовам вялікарускай (рускай), маларускай (украінскай) і беларускай народнасцей на працягу XIII-XVII ст. Сучасныя ўкраінская і беларуская мовы як мовы розных нацый пачалі складвацца ў XVIII ст. з прычыны развіцця капіталістычных адносін і нацыянальна-вызваленчага руху на тагачасных Украіне і Беларусі. Карыстаючыся параўнальна-гістарычным метадам, мовазнаўцы рэканструявалі ўсходнеславянскую, заходнеславянскую і паўднёваславянскую, а таксама агульнаславянскую мовы-асновы сучасных славянскіх моў, якія складаюць асобную групу ў сям'і індаеўрапейскіх моў (побач з індыйскай, іранскай, германскай, раманскай і інш.).

Супастаўляльны, або сінхронна-супастаўляльны, метад – гэта сістэма навуковых прыёмаў, пры дапамозе якіх выяўляюцца агульныя і прыватныя ўласцівасці дзвюх ці некалькіх моў на пэўным сінхронным зрэзе ці на працягу ўсёй гісторыі незалежна ад генезісу той або іншай мовы. Пры супастаўляльным аналізе найперш выяўляецца спецыфіка той ці іншай мовы ў адносінах да фанетыкі, граматыкі, лексікі, словаўтварэння, стылістыкі пэўнай, канкрэтнай мовы (напрыклад, беларускай да рускай і ўкраінскай, рускай да беларускай і ўкраінскай і г.д.). Супастаўляльны метад дазваляе параўноўваць не толькі роднасныя, але і няроднасныя мовы

Репозиторий ВГУ

(напрыклад, беларускую з англійскай і французскай, рускую з нямецкай і іспанскай, нямецкую з польскай і інш.).

Мэтай супастаўляльнага аналізу блізкіх і роднасных моў, накшталт беларускай і рускай, з'яўляецца ўстанаўленне як аднолькавых, так і адрозных прымет, нягледзячы на тое, што адрознага ў такіх мовах значна менш, чым агульнага. Менавіта адрозненням, якія існуюць на любым узроўні кожнай з супастаўляльных моў, удзяляецца асноўная ўвага. Найбольш важнымі прынцыпамі супастаўляльнага вывучэння блізкароднасных моў могуць быць такія:

1) немагчымасць супастаўлення моў цалкам ці толькі пэўных іх элементаў у розных часавых планах;

2) супастаўленне не разрозненых фактаў ці элементаў асобных моў, а моўных адзінак ці сістэм, што знаходзяцца ў пэўнай сувязі з іншымі моўнымі адзінкамі ці сістэмамі ў той жа мове і функцыянальна блізкія або зусім тоесныя адпаведным элементам у супастаўляльнай мове (мовах);

3) супастаўленне шляхам аналізу ад значэння да структуры або наадварот.

Супастаўляльны метад з'яўляецца асновай супастаўляльнага мовазнаўства, якое пачынаецца галоўным чынам з моўнай практыкі ва ўмовах білінгвізму ці полілінгвізму (складанне перакладных двухмоўных, трохмоўных і г.д. слоўнікаў, даведачных супастаўляльных граматык і стылістык, размоўнікаў і інш.) і заканчваецца вызначэннем моўных тыпаў і ўніверсалій (таго агульнага, што ўласціва ўсім чалавечым мовам). Такім чынам, вынікі супастаўляльнага мовазнаўства паспяхова выкарыстоўваюцца ў тыпалагічным мовазнаўстве, якое разглядае асобныя мовы як звёны адзінай агульначалавечай мовы.

Адрозненне параўнальнага метаду ад супастаўляльнага неабходна бачыць у тым, што першы арыентуецца на выяўленне падобнага, другі – на выяўленне адрознага.

Вывучэнне лексікі, фанетыкі, граматыкі, заснаванае на гістарычным і параўнальна-гістарычным падыходзе, не дае магчымасці ўбачыць усе моўныя сістэмы ў дзеянні, абмяжоўваецца рамкамі лексіка-фанетычнага аблічча слова і яго спалучальнасцю з іншымі словамі ў словазлучэнні ці сказе, не адрознівае мовы і маўлення. У адрозненне ад параўнальна-гістарычнага метаду супастаўляльны выкарыстоўвае ўсё для тлумачэння моўных фактаў сучасных моў і далейшага прагназавання асноўных тэндэнцый іх развіцця. Акрамя таго, супастаўляльны аналіз перакладаў значных тэкстаў ці кантэкстаў з адной мовы на другую (іншыя) дазваляе надзвычай шырока і поўна ўбачыць суадносіны як унутраных, так і знешніх асаблівасцей маўлення на пэўным этапе развіцця супастаўляльных моў (як роднасных, так і народнасных). Гэта і прыняло да актывізацыі тыпалагічнага вывучэння моў, да трох відаў чляненння той ці іншай мовы: узроўневага, падузроўневага і надузроўневага. Таму зараз актывізаваліся такія моўныя дысцыпліны, як семасіялогія, стылістыка, псіхалінгвістыка. На сучасным этапе развіцця нават толькі еўрапейскіх моў актыўна выдзяляюцца як самастойныя фразеалогія, культура мовы, лінгвістыка тэксту (транслінгвістыка).

У апошнія дзесяцігоддзі развіцця мовазнаўства супастаўляльны метад непасрэдна ўваходзіць у склад тыпалагічных метадаў, нібы раствараецца ў іх, ствараючы тым самым разнавіднасці тыпалагічнага метаду. Тыпалагічнае падабенства з'яўляецца найбольш агульным відам структурнага падабенства

Репозиторий ВГУ

паміж моўнымі сістэмамі, паколькі яно не абмежавана ні прасторавымі, ні часавымі рамкамі і можа вызначацца для любых моў і любых станаў моў, прычым падабенства ў форме не мае на ўвазе падабенства ў значэнні, і наадварот. У пэўным сэнсе тыпалогію можна разглядаць і як працяг гістарычнай кампаратывістыкі.

4. Параўнальна-гістарычны метад у мовазнаўстве. Параўнальна-гістарычны метад даследавання моў узнік у канцы XVIII – пачатку XIX ст. Сярод даследчыкаў-славістаў, якія карысталіся параўнальна-гістарычным метадам, выдатнае месца належыць такім рускім вучоным, як М.В. Ламаносаў, А.Х. Вастокаў, І.І. Сразнеўскі, Ф.І. Буслаеў, А.А. Патабня, Ф.Ф. Фартунатаў, А.А. Шахматаў, Я.Ф. Карскі, М.М. Дурнаво, А.М. Сялішчаў, П.С. Кузняцоў і інш.

Гэтым метадам карыстаюцца пры даследаванні роднасных моў. Пры гэтым галоўная ўвага накіроўваецца на вывучэнне гукавой сістэмы і граматычнага ладу даследуемай мовы з часу яе ўзнікнення да сучаснага стану шляхам параўнання з іншымі роднаснымі мовамі.

Пры параўнальна-гістарычным даследаванні моў вучоныя зыходзяць з пэўных выпрацаваных навуковых прынцыпаў, асноўная сутнасць якіх заключаецца ў наступным.

1) Наяўнасць у розных мовах аднолькавых ці блізкіх граматычных сродкаў (канчаткаў, суфіксаў, прыставак), пры дапамозе якіх утвараюцца адпаведныя граматычныя формы, можа служыць адным з доказаў роднаснасці гэтых моў, бо, як правіла, формаўтваральныя марфемы не запазычваюцца адной мовай з другой, а запазычаныя словы атрымліваюць граматычнае і гукавое афармленне ў адпаведнасці з нормамі той мовы, у якую яны перайшлі. Напрыклад, у такіх лацінскіх словах, запазычаных усходнімі мовамі, як *praesidium, corpus, globus, receptum,* лацінскія канчаткі *-um, -us,* невядомыя гэтым мовам, або сталі часткай асновы (руск. *президиум, корпус, глобус;* беларуск. *прэзідыум, корпус, глобус;* укр. *глобус, корпус),* або страціліся (руск. *рецепт,* беларуск. *рэцэпт,* укр. *рецепт),* ці замяняюцца канчаткамі запазычыўшай мовы (укр. *презйдія).* Таму параўнанне такіх, напрыклад, форм, як лацінск. *laudant* (хваляць), ст.-сл. *хвалетъ* – з блізкімі канчаткамі *-ant, -et,* руск. *хвалят,* дзе *-at* з *et,* дае падставу меркаваць аб агульнасці паходжання гэтага канчатка ў роднасных мовах індаеўрапейскай сям'і.

2) Адны і тыя ж прадметы, з'явы, прыметы і іншае ў розных мовах абазначаецца рознымі гукавымі комплексамі – словамі. Напрыклад, усходнеславянск. *дом,* нямецк. *Haus,* французск. *maison* абазначаюць адзін і той жа прадмет пры дапамозе розных гукавых комплексаў. Таму наяўнасць у розных мовах аднолькавых ці блізкіх у гукавых адносінах слоў, якія абазначаюць адны і тыя паняцці, можа разглядацца як сведчанне агульнасці паходжання гэтых слоў, напрыклад: лацінск. *mater,* нямецк. *Mutter,* грэчаск. *meter,* ст.-сл. *матерь,* руск. *мать,* беларуск. *маці,* укр. *мати;* лацінск. *novus,* грэчаск. *neos,* старажытна-індыйск. *navas,* руск. *новый,* беларуск. *новы,* укр. *новий.* Аднак у розных мовах могуць быць аднолькавыя словы і ў выніку запазычанняў; такія словы не даюць падставы меркаваць аб роднаснасці тых моў, у якіх яны ўжываюцца.

3) У розных мовах адбываюцца гукавыя змяненні ў адпаведнасці з пэўнымі заканамернасцямі – фанетычнымі законамі, спецыфічнымі для

Репозиторий ВГУ

кожнай мовы. Гэтыя заканамернасці дзейнічаюць на працягу пэўнага перыяду і ахопліваюць усе словы мовы. У сувязі з існаваннем у кожнай мове ўласцівых для яе фанетычных законаў адны і тыя ж словы агульнага паходжання атрымліваюць у гэтых мовах рознае гукавое аблічча (а таксама граматычнае афармленне, пры гэтым можа змяняцца і першапачатковае значэнне слова), напрыклад: руск., беларуск., укр. *груда;* лацінск. *rudus* (з **ghrendos)* – біты камень, галька, друз, вапна; літоўск. *grusti* – таўчы, трамбаваць; латышск, *grands* – зярно, *grudit* – таўчы; старажытнапаўночнагерманск. *griot* – камень; англасаксонск. *greot* – пясок, пыл, зямля; кіпрскае *gro* – буйны пясок – з агульнаіндаеўрапейскага кораня **ghreud* – расцерці, «груба датыкацца да чаго-небудзь», руск. і ўкр. *гряда,* беларуск. *града,* чэшск. *hrada* – бэлька, града; польск. *grzeda* – жэрдзь, града; літоўск. *grauda* – жэрдзі на бэльках; латышск, *grida, grids* – падлога; лацінск. *grunda, suggrunda* – жэрдзь уздоўж сцяны дома для апоры крокваў; англасаксонск. *grin-del* – засаўка.

Шляхам параўнальна-гістарычнага даследавання роднасных моў устанаўліваюцца перажытыя імі ў мінулым фанетычныя працэсы і выводзяцца гукавыя адпаведнасці ў гэтых мовах, на аснове якіх гіпатэтычна аднаўляюцца першапачатковыя формы слоў – так званыя архетыпы.

4) Пры параўнальна-гістарычным даследаванні моў улічваецца, што розныя мовы і паасобныя іх кампаненты развіваюцца нераўнамерна, на аснове сваіх унутраных законаў. У сувязі з гэтым у адных мовах могуць захоўвацца тыя ці іншыя старажытныя гукавыя або граматычныя формы, якія зніклі ў другіх роднасных мовах, што дае матэрыял для меркавання аб гістарычных працэсах у вывучаемых мовах. Так, напрыклад, ва ўкраінскай мове паслядоўна ўжываецца клічная форма, якая знікла ў рускай мове і часткова сустракаецца яшчэ ў жывой беларускай мове; у беларускай і ўкраінскай мовах захавалася форма першай асобы множнага ліку загаднага ладу (бел. *чытайма, станьма;* укр. *чйтаймо, станьмо),* невядомая сучаснай рускай мове.

Нягледзячы на значныя поспехі, дасягнутыя мовазнаўствам на аснове параўнальна-гістарычнага метаду даследавання, ён не пазбаўлены недахопаў, якія абумоўлены шэрагам прычын: нязначнай колькасцю агульных рыс, якія захаваліся ў розных тыпах роднасных моў, і накіраваннем галоўнай увагі на выяўленне гэтых рыс пры недастатковай увазе разыходжанням у роднасных мовах; адсутнасцю старажытных пісьмовых помнікаў для значнай часткі роднасных моў (напрыклад, найстаражытнейшыя грэчаскія пісьмовыя помнікі датуюцца VII ст. да н.э., старажытнарускія – X ст. н.э., літоўскія – XVI ст. н.э.). Аднак параўнальна-гістарычнае даследаванне прынесла вялікую карысць мовазнаўчай навуцы і шырока праводзіцца як айчыннымі, так і замежнымі мовазнаўцамі.

5. Даследаванне праблемы ўзаемадзеяння рускай, беларускай і ўкраінскай моў вядзецца ўжо не першае дзесяцігоддзе, аднак яна яшчэ далёка не завершана. Такое сцвярджэнне справядліва для прыватных аспектаў дадзенай праблемы, напрыклад, адносна пытання пра ўплыў беларускай мовы на рускую. Аб'ектыўныя прычыны слабай вывучанасці гэтага ўплыву караняцца ў генетычнай блізкасці і цесных гістарычных сувязях беларускай, рускай і ўкраінскай моў, што ў значнай ступені вызначае складанасць грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурна-гістарычных і этналінгвістычных умоў, у якіх адбывалася і адбываецца іх

Репозиторий ВГУ

узаемадзеянне і ўзаемаўплыў. Разам з тым, на думку даследчыкаў, якія цікавіліся пазначанай праблемай, уклад беларускай мовы ў скарбніцу рускай літаратурнай мовы велізарны і бясспрэчны. Яшчэ ў 1871 г. этнограф П.А. Бяссонаў пісаў, што беларуская мова, у XVI-XVII стст. стала мовай усёй Заходняй Русі і стала вельмі важным кампанентам вялікарускай літаратуры. Акадэмік В.В.Вінаградаў лічыў, што для гісторыі рускай мовы яго жывая сувязь з украінскай і беларускай мовамі была ў вышэйшай ступені плённай – яны ўнеслі вялікі ўклад у слоўнікавую скарбніцу рускай мовы. Паказваючы на шматзначнасць формаў узаемаўплыву ўсходнеславянскіх моў, Ф.П. Пугач сцвярджаў, што ў XVI–XVII стст. відавочна пераважала ўкраінска-беларускае ўздзеянне на рускую літаратурную мову, а ў XIX–XX стст. стаў прыкметным уплыў рускай мовы на ўкраінскую і беларускую літаратурныя мовы. Значэнне такога роду сведчанняў у тым, што ў іх сцвярджаецца наяўнасць уплыву беларускай мовы на рускую і паказваецца на некаторыя фактары моўнага характару, якія вызначалі такі ўплыў.

Спецыфіка ўплыву беларускай мовы на рускую ў гістарычным развіцці гэтых дзвюх моў абумоўлівалася і наяўнасцю ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы не злучаных паміж сабой адносінамі пераемнасці літаратурнай мовы XV–XVII стст. і новай літаратурнай мовы, якая зарадзілася і склалася на народна-дыялектнай аснове ў XIX ст. Як вядома, XVIII ст. і першая палова XIX ст. былі перыядам заняпаду беларускай пісьменнасці. Нароўні з гэтымі працэсамі на ўсім працягу існавання беларускай народнасці, а затым нацыі, функцыянавалі дыялектныя формы беларускай агульнанароднай мовы ў іх бесперапынным унутраным развіцці і кантактах з гаворкамі суседніх славянскіх моў, уключаючы рускую. Дыялектныя кантакты спрыялі пранікненню шэрагу беларусізмаў у рускія літаратурныя творы. Хоць узаемаўплыў дыялектаў беларускай і рускай моў не падвяргаецца сумненню, аднавіць поўную яго карціну цяжка. Мяркуецца, што яно закранала, у прыватнасці, такія старажытныя мікрасістэмы, як тэрміны сваяцтва, батанічная, побытавая лексіка і інш.

Узаемадзеянне кніжнай старабеларускай мовы з кніжнай рускай ажыццяўлялася як на тэрыторыі Рускай дзяржавы, так і на тэрыторыі Беларусі, прычым геаграфіяй кантакту вызначаліся інтэнсіўнасць і формы ўзаемадзеяння дзвюх моў. Вялікі ўплыў аказалі выхадцы з Беларусі і Украіны на развіццё рускага вершаскладання, літаратурных стыляў і кірункаў, новых відаў літаратурнай творчасці. Прыкметная асветніцкая, культурная і эканамічная роля беларусаў у жыцці Рускай дзяржавы XVI–XVII стст. вызначыла і ўплыў беларускай мовы на рускую. Элементы беларускай мовы пранікалі не толькі ў вусновую гаворку, паколькі выхадцы з Беларусі займаліся перакладамі, кнігавыдавецкай дзейнасцю, літаратурнай творчасцю, справавой перапіскай. Усім сказаным і тлумачыцца наяўнасць у рускай пісьменнасці канца XVI – пачатку XVIII ст. у шэрагу беларускіх лексем (многія з іх вядомы таксама ўкраінскай і польскай мовам) тыпу *державца, подчаший, рада, уживать* і многіх іншых.

З канца XVII – пачатку XVIII ст. уплыў беларускай мовы на рускую літаратурную мову на тэрыторыі Расіі рэзка змяншаецца. Гэта звязана з памяншэннем ролі, якую сталі адыгрываць беларусы ва ўсіх сферах жыцця рускай дзяржавы. Аналізуючы ўмовы, прычыны і формы ўплыву

Репозиторий ВГУ

беларускай мовы на рускую, варта прымаць да ўвагі агульнасць іх паходжання, якой вызначаецца структурная блізкасць гэтых моў, якая палягчае магчымасць даволі лёгка запазычаць адзін у другога тыя ці іншыя элементы і нават адносна лёгка разумець беларускі тэкст носьбітамі рускай мовы. Беларуская мова адыграла важную пасрэдніцкую ролю ў запазычанні рускай мовай лексікі заходнееўрапейскага паходжання.

Узаемадзеянне беларускай і рускай моў на тэрыторыі Беларусі было некалькі іншым. Вядома, што літаратурныя мовы сучасных усходнеславянскіх народаў – рускага, украінскага і беларускага – утварыліся на аснове старажытнаўсходнеславянскай мовы, якая з'яўляўся агульнай для ўсіх усходніх славян на працягу X-XIV стст. Таму беларуская і руская мовы маюць агульны лексічны фонд, які сваім паходжаннем узыходзіць да гэтага перыяду.

Аналізу фактаў уздзеяння рускай мовы на беларускую лінгвісты надаюць вялікую ўвагу (працы А.Е. Баханькова, М.Г. Булахова, А.М. Булыкі, А.А. Гіруцкага, А.І. Жураўскага, М.І. Канюшкевіч, І.І. Крамко, Л.М. Шакуна, П.П. Футры, А.І. Яновіч і інш.). Аднак зрабіць вычарпальны спіс рускіх лексем, запазычаных беларускай мовай, і пералічыць лексемы іншамоўнага паходжання, якія прыйшлі ў беларускую мову праз рускую, няма магчымасці ў сілу іх шматлікасці. Па прыблізных падліках М.І. Крукоўскага, зробленым у 50-я гг. XX ст., запазычанні з рускай лексікі складаюць 3-5 працэнтаў слоўнікавага складу беларускай літаратурнай мовы, а іншамоўныя словы, запазычаныя праз рускую мову, – 13–15 працэнтаў. У наш час Рэспубліка Беларусь з’яўляецца шматнацыянальнай дзяржавай з шырокім распаўсюджаннем беларуска-рускага двухмоўя.

Пытанні для самаправеркі і самакантролю

1. Акрэсліце аб’ект, прадмет, змест і задачы параўнальнай граматыкі ўсходнеславянскіх моў.
2. Назавіце асноўныя дасягненні ўсходнеславянскай кампаратывістыкі.
3. Ахарактарызуйце асаблівасці параўнальна-гістарычнага (кампаратыўнага) метаду мовазнаўства.
4. Ахарактарызуйце асаблівасці сінхронна-супастаўляльны метаду мовазнаўства.
5. Прааналізуйце гісторыю ўзаемадзеяння ўсходнеславянскіх моў.

ТЭМА 2. Лексіка-фразеалагічная сістэма ўсходнеславянскіх моў

Пытанні

1. Лексікалогія ўсходнеславянскіх моў як навука.
2. Міжмоўныя ўсходнеславянскія кантакты. Запазычанні.
3. Асаблівасці слоўнікавага складу ўкраінскай мовы.
4. Асаблівасці супастаўляльнага аналізу ўсходнеславянскіх фразеалагічных адзінак.

Репозиторий ВГУ

Паняційны апарат: лексіка, фразеалогія, міжмоўныя амонімы, паралексы, генезіс, блізкароднасць, запазычанні, эквівалент, безэквівалентнасць.

Літаратура

1. Анічэнка, У.В. Мовы ўсходніх славян / У.В. Анічэнка. – Мінск, 1989.
2. Анічэнка, У.В. Гістарычная лексікалогія ўсходнеславянскіх моў / У.В. Анічэнка. – Гомель, 1978.
3. Брицын, М.А. Из истории восточнославянской лексики / М.А. Брицын. – Киев, 1965.
4. Булахов, М.Г. Основные вопросы сопоставительной стилистики русского и белорусского языков / М.Г. Булахов. – Минск, 1979.
5. Булахов, М.Г. Особенности интерференции русского и белорусского языков. Проблемы двуязычия и многоязычия / М.Г. Булахов. – Москва, 1972. – С. 217-224.
6. Вопросы русской и белорусской грамматики и лексикологии. – Минск, 1978.
7. Выхота, В. Беларуска-рускі слоўнік: міжмоўныя амонімы, паронімы і полісемія / В. Выхота. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004.
8. Грабчиков, С.М. Межъязыковые омонимы и паронимы. Опыт русско-белорусского словаря / С.М. Грабчиков. – Минск, 1980.
9. Ефимов, А.И. Задачи сравнительной стилистики восточнославянских языков / А.И. Ефимов. – Москва, 1963.
10. Козырев, И.С. К вопросу сравнительно-исторической лексикологии русского и белорусского языков / И.С. Козырев. – Минск, 1980.
11. Крукоўскі, М.І. Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову / М.І. Крукоўскі. – Мінск, 1958.
12. Манакин, В.Н. Основы контрастивной лексикологии: близкородственные и родственные языки / В.Н. Манакин. – Киев; Кировоград, 1994.
13. Михневич, А.Е. Паралексы / А.Е. Михневич // Русский язык. – Мн., 1981. – С. 137-141.
14. Словарные составы русского и белорусского языков в их историческом развитии и современном состоянии. – Минск, 1980.
15. Сравнительно-сопоставительное изучение лексики русского и белорусского языков. – Минск, 1981.
16. Супрун, А.Е. Сопоставительно-типологический анализ лексики / А.Е. Супрун // Методы изучения лексики. – Минск, 1975.
17. Супрун, А.Е. Лексическая типология славянских языков / А.Е. Супрун. – Минск, 1983.
18. Шуба, П.П. Міжмоўная беларуска-руская аманімія і паранімія // Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў / П.П. Шуба. – Мн., 1982. – С. 106 – 131.

1. Лексікалогія – раздзел мовазнаўства, які вывучае слоўнікавы склад мовы (лексіку). Тэрмін “лексіка” ахоплівае ўсю сукупнасць слоў і іх значэнняў, якія функцыянуюць у мове. Слова – гэта найменшая самастойная адзінка мовы, якая называе пэўны прадмет, працэс, з’яву аб’ектыўнай реальнасці або ўказвае на іх.

Репозиторий ВГУ

Асноўная функцыя слова ва ўсіх трох мовах – намінатыўная (функцыя называння). Слова можа называць канкрэтны прадмет (*зошит – сшытак – тетрадь; книжка – кніжка – книжка*), прыродныя з'явы (*дощ – дождж – дождь, вітер – вецер – ветер*), прыметы прадмета (*чорний – чорны - черный, великий – вялікі – большой*), колькасць (*сім – сем – семь; чотириста – чатырыста – четыреста*), дзеянне, працэс, стан (*конспектувати – канспектаваць – конспектировать, хворіти – хварэць – болеть*), прыкметы дзеяння (*швидко – хутка – быстро*).

Словы з канкрэтным значэннем называюць усё тое, што чалавек успрымае органамі пачуцця: *будинок – будынак – здание; білый – белы – белый; Гнат – Ігнат - Игнат; малювати – маляваць – рисовать.*

Да слоў з абстрактным значэннем належаць такія паняцці, якія не маюць рэальнага адлюстравання. Яны ўказваюць на стан (*сон – сон – сон, тиша – цішыня – тишь*), пачуцці (*кохання – каханне – любовь, ненависть – нянавісць – ненависть*), працэс (*біг – бег – бег, читання – чытанне – чтение*), рысы характару (*доброта - дабрыня – доброта; толерантність – талерантнасць – толерантность*), розныя праяўленні інтэлектуальнага ўзроўню людзей (*розум – розум – разум, знання – веды – знания*).

Паўназначныя словы ва ўсіх трох усходнеславянскіх мовах маюць лексічнае і граматычнае значэнне, выконваюць намінатыўную функцыю і суадносяцца з паняццем.

Непаўназначныя словы не маюць лексічнага значэння, выражаюць адносіны паміж паўназначнымі словамі і не суадносяцца з паняццямі: *від – ад –от; до – да – к; під – пад – под*.

2. У лексіцы ўсходнеславянскіх моў у аснове, узятай з праславянскай мовы, выяўляюцца спецыфічныя ўсходнеславянскія элементы, не ўласцівыя паўднёваславянскім і заходнеславянскім мовам. Разыходжанні паміж усходнімі і іншымі славянамі ўжо ў VI-VII стагоддзях складалі каля адной трэцяй часткі ўсяго славянскага слоўнікавага складу; сюды ўключаюцца таксама словы, якія ўзніклі ў адносна познія эпохі асобных усходнеславянскіх моў. Лексіка ўсходнеславянскіх моў характарызуецца вялікай колькасцю запазычанняў з розных моў. У рускай мове адзначаюцца старажытныя запазычанні з усходніх моў (цюркска-мангольскіх), навейшыя – з заходнееўрапейскіх моў (найперш з французскай, нямецкай, англійскай моў). Ва ўкраінскай і беларускай мовах адлюстроўваецца значны ўплыў польскай лексікі.

Украінска-беларускія моўныя кантакты пачаліся яшчэ ў перыяд Русі на базе цесных узаемаадносінаў протабеларускіх плямёнаў з палянамі і Кіевам. Такія кантакты сталі сталымі ў XIV-XVII стст. у рамках сумеснай украінска-беларуска-літоўскай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, у якой дзяржаўнай літаратурна-пісьмовай мовай была агульная беларуска-ўкраінская пісьмовая гаворка.

Узбагачэнне ўкраінскай пісьмовай практыкі беларусізмамі актыўна адбывалася менавіта ў гэты перыяд. Асобныя словы і выразы, якія ў беларускіх выданнях часам адбіваліся непаслядоўна, ва ўкраінскай пісьменнасці сталі літаратурнай нормай (*присегнуты, седечы, ездечы, навезаты, понеделокъ г.д.*). Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыграла перакладніцка-выдавецкая дзейнасць беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Яго пераклады біблейскіх кніг на "простую мову" з арыгінальнымі прадмовамі і пасляслоўямі распаўсюджваліся таксама ва

Репозиторий ВГУ

Украіне і сталі ўзорам для пераймання ўкраінскімі кніжнікамі XVI ст. (Васіль Жугаевіч з Яраслава, Лука Цярнопальскі і інш.). У выніку творчага развіцця скарынаўскіх традыцый ва Украіне з'явіліся перакладзеныя "на мову Рускую" перасопніцкае Евангелле (1556–1561 гг.), Крэхаўскі Апостал (1563–1572 гг.), Евангелле Негалеўскага (1581 г.) і інш. Элементы беларускай мовы праніклі нават у Астрожскую Біблію (1581 г.).

З канца X ст. усходнія славяне ў сувязі з распаўсюджаннем хрысціянства атрымалі пісьменнасць, якая прыйшла з Балгарыі (кірыліца і глаголіца). Узніклі дзве блізкароднасныя, але генетычна і функцыянальна розныя літаратурных мовы: стараславянская мова і старажытнаруская (агульнаўсходнеслаянская) мова, паміж якімі існавала ўзаемадзеянне. Сучасныя нацыянальныя літаратурныя мовы ўсходніх славян склаліся ў XIX–XX стагоддзях (беларуская мова, руская мова, украінская мова).

Сучасная лексіка ўкраінскай мовы мае шмат агульнага таксама з рускай, беларускай, славацкай мовамі. На ўзроўні гутарковай мовы шмат агульнага з рускай і беларускай, літаратурная мова (тэрміны, паняцці і т.п.) мае шмат агульнага з польскай і славацкай. Лексіка ўкраінскай мовы больш за ўсё набліжана да беларускай (каля 75% агульнай лексікі), польскай, славацкай, балгарскай (каля 70%), рускай, чэшскай (каля 60%) моў.

Беларусізмамі ў сучаснай украінскай літаратурнай мове лічацца словы *горячий, летучая мышь, калач, вилка, хозяин* і г.д. У сваю чаргу, старабеларуская пісьменнасць узбагачалася шляхам пранікнення ў яе некаторых спецыфічных рыс украінскай мовы. Украінскі ўплыў на беларускую пісьменнасць паступова ўзмацняўся ў XVII ст. (У "Лексіконе" Бярынды 1653 г., выдадзеным Куцейскай друкарняй пад Оршай у Беларусі, словы пададзены паводле ўкраінскага вымаўлення (у кіеўскім выданні 1627 гэтыя словы прадстаўлены ў традыцыйнай царкоўнаславянскім арфаграфіі: досыць – *досыть* (досыць, *жолтныца - жолтяница, цилитель - цлитель* і г.д.).

Новая хваля беларуска-ўкраінскіх моўных адносін у XIX ст. была звязана з папулярнасцю ў Беларусі паэзіі Т. Шаўчэнкі і арыентацыяй шматлікіх прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры на народную аснову і на ўкраінскую класічную літаратуру.

3. Міжмоўныя амонімы – словы, якія маюць рознае значэнне і часткова супадаюць у гукавых адносінах у рускай і беларускай, рускай і ўкраінскай, украінскай і беларускай мовах. Міжмоўныя амонімы, паронімы і паралексы ўзнікаюць часцей за ўсё ва ўмовах двухмоўя; узнікненне іх звязана з інтэрферэнцыяй, узаемапранікненнем моў: бел. *блага* – дрэнна; рус. *благо* –добро; бел. *плот, склон, запрасіць* – рус. *плот, склон, запросить*; рус. *шар* – круглы прадмет; укр. *шар* – пласт чаго-небудзь; рус. *неделя, уродливый, гроши* – укр. *неділя, вродливий, гроші*. **Паралексы** – словы з дзвюх моў, якія пры знешнім падабенстве адрозніваюцца марфемнай структурай, вымаўленнем, націскам, прыналежнасцю да часціны мовы і інш: *баразна – борозда, калідор – коридор, бараноў – баранов, камяні – камни, язмін – жасмин, цига́н (цыга́н) – ци́ган*.

4. Слоўнікавы склад украінскай мовы аб’ядноўвае дзве групы лексічных адзінак:

1) спрадвечна ўкраінскія слова;

2) слова, запазычаныя з іншых моў.

Репозиторий ВГУ

Станаўленне спрадвечнай ўкраінскай лексікі можна прадставіць у такой храналагічнай паслядоўнасці: індаеўрапейскі лексічны склад -> праславянскі лексічны склад -> уласна ўкраінскі лексічны склад.

У складзе спрадвечна ўкраінскай лексікі вылучаюцца наступныя тэматычныя групы ў суадносінах з індаеўрапейскім моўным адзінствам:

- Назвы прадметаў і з'яў прыроды: *небо, сонце, земля, день, ніч, зима, весна, літо, море, вогонь*;
- Назвы раслін, жывёл, рыбы, птушак і насякомых: *береза, верба, осина, вовк, бобер, видра, вівця, щука, лосось, оса;*
- Назвы сваяцкіх і сямейных адносінаў: *тато, батько, мати, син, дочка, брат, сестра, свекор, зять*;
- Назвы жытла і яго частак, прылад працы, прадуктаў харчавання: *дім, двір, мед, мясо, сіль, віз, колесо, вісь*;
- Назвы дзеяння і стану: *жити, сидіти, їсти, відати, знати, спати;*
- Назвы органаў і частак чалавечага цела: *мозок, волос, око, брова, язик, коліно, долоня*;
- Назвы лічбаў: *один, два, три, чотири, п 'ять, шість, сім, вісім, дев 'ять, десять, сто, тисяча.*

Прыведзеныя вышэй словы з'яўляюцца характэрнымі для ўсіх або большасці моў індаеўрапейскай сям'і.

Да праславянскай лексікі належаць словы: *білий, посол, гнів, стид, гіркий, я, ми, він, з, за, у (в), там, тут, як та ін.*

Аснову праславянскага слоўніка склала праіндаеўрапейская лексіка. На працягу доўгага часу праславянская мова была адзінай, гэтым тлумачыцца значная блізкасць паміж славянскімі мовамі. У апошняе тысячагоддзе гісторыі ў іх узнікае шэраг дыялектаў, на аснове якіх у далейшым сфарміруюцца рысы славянскай мовы. Да славянскай лекіскі належаць такія словы, як *дядько, племінник, тулуб, кулак, собака, кішка, зозуля, жайворонок, молочай, хвощ, гречка, осока, кажан, поміст, скирта, урожай, озимина, ярина, сіножать, кочувати, чахнути, черкати, журба, суть, хороший, тепер, поки, сьогодні.* Ва ўсходнеславянскай мове паступова ўзнікаюць словы, уласцівыя толькі ўкраінскай мове – уласна ўкраінскія, або спецыфічна ўкраінскія: *штани, запаска, хустина, ремінець, свита, намисто, жнива, жниварка, молотарка, вареники, галушки, деруни, сніданок, чарівний, весняний, яскравий, коханий, недолік, повітря, хурделиця, багаття, лелека, годинник, паляниця, корж, очолити, вибагливо, козачок, бандура, держава.*

Гэтыя словы можна распазнаць па фанетычных прыкметах:

1) [о], [е] у адкрытым складе чаргуецца з [і] у закрытым складзе: *село - сільський*;

2) [е] змяняецца на [о] пасля шыпячых і [й]: *женити - жонатий, шести - шостий*;

3) наяўнасць гука [и] пасля [ж], [ч], [ш], [г], [к], [х] у корані слоў: *хист, чимчикувати.*

Для ўласна ўкраінскіх слоў характэрны і словаўтваральныя асаблівасці. Гэта суфіксы -ій- (*вередій, скупій, багатій, торохтій, плаксій, палій, хвалій*); -ин- (*година, хвилина, стрілянина, біганина, Київщина*); -інь-(*бистрінь, далечінь, глибінь, теплінь, просторінь*); -ач- (-яч-) (*сіяч, викладач, спостерігач*); -ощ-

Репозиторий ВГУ

(*веселощі, грубощі, жалощі, прикрощі, пустощі, радощі*); -ець- (*промовець*); -енк- (*Вівчаренко, Бондаренко, Коваленко, Кравченко*); -к- (*відвідувачка, лікарка*).

Сярод уласна ўкраінскіх слоў ёсць і непаўназначныя лексемы: *якби, як, чи, хіба, хай, нехай, майже, саме, якраз, либонь, проміж, поміж, поза, з-посеред, щоб, зате, проте, ніби, нібито, немовби.*

5. Украінская мова ўвесь час знаходзілася ў цесных кантактах з іншымі мовамі, гэта абумовіла запазычанні некаторых слоў, якія арганічна ўвайшлі ў лексічную сістэму ўкраінскай мовы. Запазычанне іншамоўных слоў можа адбывацца непасрэдна або праз пасрэдніцтва іншай мовы.

Усе іншамоўныя словы падзяляюцца на 2 групы:

а) запазычанні са славянскіх моў;

б) запазычанні з неславянскіх моў.

Да першага тыпу запазычанняў належать стараславянізмы – словы, якія ўкраінская мова засвоіла са стараславянскай.

Для стараславянізмаў характэрны наступныя моўныя асаблівасці:

а) фанетычныя:

- гукаспалучэнні [ра], [ла], [ре], [ле] адпаведна да славянскіх [оро], [оло], [єре], [еле]: *врата - ворота, глас - голос, древо - дерево, храм - хороми, шлем - шолом;*
- гукаспалучэнні [йе], [йу] напачатку слова: *єдиний, юнак*;
- гукаспалучэнне [жд]: *вождь, страждати*;

б) словаўтваральныя:

- прыстаўкі воз-, со-, пред-, пре-: *возвеличити, предтеча, прекрасно;*
- суфіксы назоўнікаў: -тель-, -ств-(о), -тай, -знь, -ин-(я): *повелитель, багатство, ратай, приязнь, гординя.*

Ва ўкраінскай мове даволі шмат запазычанняў з рускай. Гэта словы палітычнай лексікі (*партієць, більшовик, комсомол, народовець*); лексікі працоўнага класу (*завод, рудник, електропоїзд*); афіцыйна-дзелавой (*законопроект, указ*); побытавай (*сарафан, самовар, гармоніст*). Украінская мова запазычыла праз рускую значную колькасць іншамоўнай тэрміналагічнай лексікі: *конференція, декларація, канонада, кібернетика, синтез, біохімія, лауреат, аналіз.* Таксама лексіка ўкраінскай мовы папаўняецца за кошт калькавання, гэта значыць шляхам дакладнага капіравання рускіх слоў: *соцзмагання, законодавство, суднобудівник, приватновласницький*. Калькаванне чужых слоў як спосаб намінацыі магчымы тады, калі для пэўнага паняцця няма назвы ў роднай мове. Але шмат хто ведае, што трэба толькі надаць рускім словам украінскае гукавое аздабленне, як гэта слова пачынае набываць ўкраінскі сэнс. Нярэдка чуеш: *краєугольний* (замест *наріжний*) *камінь*, *ігрок* (замест *гравець*), *упрямий* (замест *упертий*). У лексіцы ўкраінскай мовы прысутнічаюць словы з беларускай: *жлукто*, *дьоготь, бадьоро, бадьорий*.

Такім чынам, украінская мова фарміравалася паслядоўна, з'яўляліся як ўласна ўкраінскія словы, так і запазычаныя з іншых моў (у першую чаргу рускай і беларускай).

6. Фразеалагізм, з уласцівымі яму ўзнаўляльнасцю ў гаворцы, семантычнай камплікатыўнасцю і цэласнасцю, шматкампанентнасцю, фармальна-граматычнай неаднастайнасцю, нацыянальнай унікальнасцю,

Репозиторий ВГУ

уяўляе сабою надзвычай важны аб'ект мовазнаўства. Супастаўляльнае вывучэнне фразеалогіі стала прадметам даследавання адносна нядаўна. Усё яшчэ няма адзінага меркавання пры вызначэнні складу фразеалогіі і яе месца ў сістэме мовы, выразна не выпрацаваны метады і прыёмы ўсталявання межаў фразеалагічных адзінак (*ФА*) і іх стрыжнёвых слоў. Не вызначаны таксама адзіныя прынцыпы лексікаграфічнай апрацоўкі фразеалагічнага матэрыялу – нават у аднатыпных слоўніках *ФА* характарызуюцца па-рознаму.

Сярод актуальных праблем узаемадзеяння трох усходнеславянскіх моў асаблівую ўвагу прыцягваюць пытанні ўзнаўлення *ФА* сродкамі мовы перакладу. Гэта ўвага абумоўлена спецыфікай і структурна-семантычнай складанасцю фразеалагічных сродкаў, узнаўленне якіх злучана з вызначанымі цяжкасцямі лінгвістычнага, агульнафілалагічнага, культуралагічнага, сацыяльнага і гістарычнага характару.

Супастаўляльны аналіз фразеалагічных адзінак рускага, беларускай і ўкраінскага моў мае вялікае як тэарэтычнае, так і практычнае значэнне. Гэтым тлумачыцца ўсё большая ўвага да пытанняў культуры вусновай і пісьмовай гаворкі не толькі ў асяроддзі філолагаў, але і ў шырокіх колах грамадскасці; да таго ж новымі праграмамі па ўкраінскай, рускай і беларускай мовах прадугледжваецца вывучэнне пытанняў фразеалогіі ў школе.

Тэарэтычнае асэнсаванне беларуска-руска-ўкраінскіх фразеалагічных паралеляў неабходна яшчэ і таму, што носьбіты гэтых блізкароднасных моў лёгка дапускаюць у гаворцы рознага роду парушэнні ў структурнай і семантычнай арганізацыі *ФА*.

7. Розныя аспекты перакладу *ФА* сталі прадметам аналізу ў фразеалагіі рускіх, беларускіх і ўкраінскіх мовазнаўцаў. У апошнія дзесяцігоддзі вывучэнне фразеалагічнага складу розных моў стала асабліва інтэнсіўным і рознанакіраваным. Апроч шматлікіх прац па асобных праблемах, пачалі з'яўляцца таксама і даследаванні агульнага характару. Тут у першую чаргу неабходна назваць працы *А.С. Аксамітава* ("Беларуская фразеалогія", 1978), *В.Л.* Архангельскага ("Устойчивые фразы в современном русском языке", 1964), *В.П.* Жукава ("Семантика фразеологических оборотов", 1978), *В.М. Мокиенко* ("Славянская фразеология", 1980) і інш. Акрамя таго, нельга не адзначыць унёсак у развіццё фразеалогіі як навукі такіх навукоўцаў, як *Ф. Буслаеў, Л. Булахоўскі, Ф. Мядзведзеў, Г. Удавічэнка, Ф. Янкоўскі* (даследаванні *агульнаславянскай* фразеалогіі); *І. Беладзед, Н. Жовтобрюх,* І. *Чараднічэнка, А. Коваль, В. Капцілаў, Л. Скрыпнік* (распрацоўка праблем фразеалогіі сучаснай украінскай літаратурнай мовы), *Л. Ройзензон, Н. Алефірэнка, Н. Бабіч* (аналіз розных аспектаў сістэмных адносін кампанентаў фразеалагічных адзінак рускай і ўкраінскай моў), *Ю. Аваліані, Н. Алексеенка, А. Архангельская, Б. Ажнюк, В. Гак* (даследаванне розных аспектаў міжмоўных адносін фразеалагічных адзінак), але рашэнне шматлікіх праблем перакладу *ФА* як перакладазнаўчай катэгорыі застаецца аднолькава актуальным як на матэрыяле блізкароднасных, так і народнасных моў.

8. Супастаўляльны аналіз *ФА* у рускай, украінскай і беларускай мовах дазваляе вылучыць дзве непрапарцыянальныя ў колькасных адносінах групы:

1. *ФА*, якія маюць фразеалагічныя эквіваленты ў іншай мове.

Репозиторий ВГУ

2. *ФА*, якія не маюць ў іншай мове эквівалентных фразеалагізмаў (іх значэнні перадаюцца пры дапамозе сінонімаў ці апісальна).

Першая група вельмі шматлікая і разнастайная, што тлумачыцца блізкасцю саміх моў і агульнасцю паходжання гэтых трох народаў. Сярод фразеалагізмаў гэтай групы вылучаюцца эквівалентныя пары, якія маюць аднолькавую структуру, і рознаструктурныя. У эквівалентных парах з аднолькавай структурай варта падкрэсліць фразеалагічную тоеснасць, якая характарызуецца поўнай лексічнай адпаведнасцю, структурнай аднастайнасцю, супадзеннем у стылістычнай характарыстыцы і спалучальнасці формаў. Лексемы, якія ўваходзяць у склад фразеалагічных тоеснасцяў, з'яўляюцца элементамі агульнага лексічнага фонду ўкраінскай, беларускай і рускай моў: *золоті рукі – залатыя рукі – золотые руки; попадати (попасть) пальцем у небо – трапляць (патрапіць) пальцам у неба – попасть пальцем в небо; з рук у руки – з рук у рукі – из рук в руки; знати своє місце – ведаць сваё месца – знать свое место; виходити (вийти) на орбіту - выходзіць (выйсці) на арбіту – выйти на орбиту; брати (взяти) під обстріл - браць (узяць) пад абстрэл – брать под обстрел; бути в контрах – быць у контрах – быть в контрах.*

Іншы тып суадносін паміж *ФА* ўкраінскай, рускай і беларускай моў, у семантычным і канструктыўным плане падобных да фразеалагічных тоеснасцяў, складаюць фразеалагічныя пары, якія ідэнтычныя па значэнні і структуры, але маюць ў сваім складзе не лексічныя тоеснасці, а лексічныя эквіваленты. Гэтыя лексічныя эквіваленты з'явіліся падчас гістарычнага развіцця слоўнікавага складу ўкраінскай, рускай і беларускай моў і адлюстроўваюць складаныя семантычныя і словаўтваральныя працэсы:

1) страту *агульнаславянскай* ці *агульнаўсходнеславянскай* лексемы ў адной мове і замену яе новаўтварэннем у іншай; напрыклад, украінскім фразеалагізмам са словам *око* ў рускай мове паслядоўна адпавядаюць звароты са словам *глаза*, а ў беларускай – *вочы*: *очі на лоба лізуть – глаза на лоб лезут – вочы на лоб лезуць, оком не моргнути – глазом не моргнуть – вокам не міргнуць*;

2) узнікненне лексем з аднолькавым значэннем, утвораных на базе аднаго і таго ж кораня пры дапамозе розных афіксаў: *лити воду на млин – лить воду на мельницу – ліць ваду на млын; ловити рибу в каламутній воді – ловить рыбу в мутной воде – лавіць рыбу ў каламутнай вадзе; мокра курка – мокрая курица – мокрая курыца;*

3) утварэнне лексічных эквівалентаў ад розных общеславянских каранёў: *давати свою голову відтяти – давать голову на отсечение – даваць галаву на адсячэнне; натискувати [на всі] педалі – нажимать [на все] педали – націскаць на ўсе педалі;*

4) узнікненне лексічных эквівалентаў з прычыны таго, што ў мовах замацаваліся ў складзе фразеалагізмаў розныя па паходжанні словы:

- у адной мове – усходнеславянскае, у другой – стараславянскае, а беларускі варыянт набліжаны да ўкраінскай мовы *(володар дум – властитель дум – уладар дум; володіти собою – владеть собой – валодаць сабой)*;
- усходнеславянскае слова, якое належыць да пэўнай групы стараславянскіх дыялектаў (*від щирого серця – от чистого сердца – ад шчырага сэрца*);

Репозиторий ВГУ

- запазычанае – агульнаславянскае ці ўсходнеславянскае *(віддати шану – отдать долг – аадаць абавязак; битися головою об мур – биться головой об стену (стенку) – біцца галавой аб сцяну; достойный кисти художника – достойний пензля художника – годны пэндзя мастака)* або не запазычанае – уласнарускае *(втрачати ґрунт під ногами – терять почву под ногами – губляць грунт пад нагамі)*;
15. Вымаўленне зычных гукаў. Зычныя гукі ў трох усходнеславянскіх мовах маюць прынцыповыя адрозненні не толькі ва ўтварэнні, але і ў рэалізацыі, г.зн. пры выкарыстанні іх у маўленчым працэсе. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні зычных у сучасных беларускай, рускай і ўкраінскіх мовах наглядна паказваюць, што сінхранія ў вымаўленні надзвычайна цесна звязана з дыяхраніяй і ўсе навейшыя арфаэпічныя нормы паступова і няўхільна выцясняюць старыя і ўстарэлыя. На сучасным этапе развіцця трох моў можна адзначыць наступныя найважнейшыя адрозненні паміж імі ў галіне вымаўлення зычных:

1) Большасць зычных гукаў утвараюць пары па глухасці – звонкасці і цвёрдасці – мяккасці, якія ў асноўным супадаюць ва ўсіх усходнеславянскіх мовах. Аднак пры параўнанні можна выявіць прынцыповыя арфаэпічныя адрозненні. Напрыклад, калі ў сучаснай рускай арфаэпіі парнымі па цвёрдасці-мяккасці з’яўляюцца [д] і [д’], [т] і [т’], то беларускай - адпаведна [д] і [дз’], [т] і [ц’]: рус. ты [ты] і тебя [т’і^{э}б’а́], дни [дни́] і [д’е́н’], бел. ты [ты] і цябе [ц’аб’е́], дні [дн’і] і дзень [дз’э́н’]. У рускай мове па звонкасці – глухасці з’яўляюцца парнымі [д’] і [т’], а ў беларускай – адпаведна [дз’] і [ц’]: рус. дядя [д’а́д’ъ] і дядька [д’а́т’къ], бел. дзядзя [дз’а́дз’а] і дзядзька [дз’ац’ка]. Дзеканне і цеканне ўласцівыя толькі беларускай мове, украінскай і рускай жа гэтая з’ява не характэрная. Увогуле, гук [ц] ва ўкраінскай мове можа быць і цвёрдым, і мяккім, у рускай мове заўсёды цвёрды і глухі, у беларускай жа мове гук [ц] зацвярдзелы.

2) Ва ўкраінскай мове не адбываецца аглушэння ў закрытых складах і на канцы слова [композі́тор’ів], [музика́нт’ів], [т’ул’па́н’ів]. Гукі [б], [п], [м], [в], [ў], [ф], [ґ], [к], [х] перад іншымі зычнымі і ў абсалютным канцы слова ў беларускай мове (акрамя [б], [в], [г] з-за іх немагчымасці быць у абсалютным канцы слова) заўсёды вымаўляюцца цвёрда : бел. б’ю [бйу́], голуб [ґо́луп], кроў [кро́ў], рус. бью[б’йу́], голубь [ґо́луп’], кровь [кро́ф’].

3) Гукі [с’], [з’], [дз’], [ц’] у беларускай мове перад усімі мяккімі зычнымі (акрамя [ф’], [ґ’], [к’], [х’]) вымаўляюцца толькі мякка. У рускай жа мове дазваляецца варыянтнасць першых двух, а апошнія два зусім адсутнічаюць. Параўн. бел. сцяна [с’ц’ана́], з’есці [з’йэ́с’ц’і] і рус . стена [ст’иэна́], съесть [сйэ́ст’].

Репозиторий ВГУ

Памылкі ва ўкраінскамоўным маўленні:

– Вымаўленне замест фанемы [ф] спалучэнне фанем [хв], а замест [хв] – фанему [ф]: **Правільна:** факт, фарба, фах, фахівець, феномен, форматний, функціонувати, хвала, хвороба. **Няправільна:** хвакт, хварба, хвах, хвахівець, хвеномен, хворматний, хвункціонувати, фала, фороба.

– Вымаўленне [л’] замест [л]: л'екція – лекція, тел'еграмма – телеграмма.

– Вымаўленне [і] замест [и] ў іншамоўных словах: директор – діректор, тираж – тіраж, симпозіум – сімпозіум, циркулярний – ціркулярний.

– Звонкія зычныя ў канцы слова і перад глухімі ў сярэдзіне слова вымаўляюцца звонка: [народ] – народ; [наказ] – наказ; [чиᵉмдуж] - чимдуж; [надто] – надто; [дов'ідка] – довідка. З усіх звонкіх зычных толькі гартанны гук [г] вымаўляецца як [*х*]: [лехко] –легко; [н'іхт'і] – нігті; [к'іхт'і] – кігті.

4) Глухія зычныя перад звонкімі ў межах слова вымаўляюцца звонка: [проз'ба] – просьба; [вогзал] – вокзал; [бород'ба] – боротьба.

5) Аглушаюцца прыназоўнік і прыстаўка перад глухімі зычнымі: [стобойу] – з тобою; [сказати] – сказати.

6) Прыстаўкі роз-, без- могуць вымаўляцца звонка і глуха (у залежнасці ад тэмпу маўлення): [розписка] і [росписка] – розписка; [беизпомиелковий] і [беиспомиелковий] – безпомилковий.

7) Губныя [б], [п], [в], [м], [ф], шыпячыя [ж], [ч], [ш] (акрамя падоўжаных) и заднеязычных [г], [к], [х] у канцы слова вымаўляюцца цвёрда: [с'ім] – сім; [вели'ч] – велич; [пишеш] – пишеш; [позичте"] – позичте; [с'м'іх] – сміх. Толькі перад [і] гэтыя зычныя вымаўляюцца як паўмяккія: [в'італ'ний] – бесплатный; [біограф'ійа] – биография; [ш'іс'т'] – шесть; [хвид] – ход; [к'ілограм] – килограмм.

Падоўжаныя шыпячыя вымаўляюцца як паўмяккія: [роздор'іж':а] – развилка; [р'іч':ів] – летий.

8) ва ўкраінскай мове трэба размяжоўваць гук [г] и [ґ]. Зычны гук [г] вымаўляецца ва ўласна ўкраінскіх словах, а таксама ўкраінізаваных словах іншамоўнага паходжання. Поўны рэестр слоў з літарай ґ, якія абазначае заднеязычны замкнёны звонкі гук [ґ], прадстаўлены ва "Украінскім арфаграфічным слоўніку", якім належыць карыстацца, бо гук ґ выкарыстоўваецца не толькі ў адпаведнасці з нормай, але і на асабістае меркаванне моўнікаў. Словы, якімі найчасцей карыстаюцца: *ґазда, ґанок, ґатунок, ґречність, ґрунт, ґрунтово-кліматичний ґрунтознавство, ґрунтуватися, ґрасувати (расчышчаць), ґаздувати, ґрати, ґречний, ґречно, ґрунтовий, ґрунтозахисний, ґрунтообробний, ґудзик.*

Змякчэнне цвёрдых зычных перад мяккімі (асіміляцыя па мяккасці) у рускай мове часцей за ўсё назіраецца ў корані слова ці на стыку кораня і суфікса. Найбольш паслядоўна такая асіміляцыя адзначаецца ў пазіцыі “цвёрдыя зубныя перад мяккімі зубнымі”. Увогуле ж у рускай мове ўсё мацней дзейнічае тэндэнцыя да страты асімілятыўнай мяккасці. У рускім вымаўленні беларусаў змякчэнне цвёрдых зубных перад мяккімі назіраецца не заўсёды. Гэта прыводзіць да своеасаблівага акцэнта, які парушае рускія арфаэпічныя нормы.

16. <u>Вымаўленне спалучэнняў зычных</u>. Яшчэ ў агульнаўсходнеславянскай мове ўзніклі рознага роду спалучэнні зычных. Самастойнае станаўленне і развіццё сучасных беларускай, рускай і

Репозиторий БГУ

ўкраінскай моў адлюстравала спецыфіку ў вымаўленні разнастайных асімілятыўных і дысімілятыўных спалучэнняў зычных. У сучасных лінгвістычных умовах варта звяртаць асаблівую ўвагу на вымаўленне наступных спалучэнняў зычных:

1) Спалучэнне [чн] ва ўкраінскай і беларускай мовах вымаўляецца адпаведна напісанню, у рускай жа мове – то як [шн], то як [ч’н]: булочная [бу́лъшнъйь] і [бу́лъч’нъйь], але [да́ч’ный], [н^ч’нъй]. Вымаўленне [шн] замест [чн] у беларускай мове – нелітаратурнае.

2) Каранёвае спалучэнне [зд] у словах тыпу *язда, яздок, ездзіць* можа выступаць зусім у розных арфаэпічных варыянтах, асабліва пры змене дзеяслоўных форм: укр. їздити [йі́здыты], їжджу [йі́жджу], бел. ездзіць [йэ́здз’іц’], езджу [йэ́жджу], рус. ездить [йэ́зд’ит’], езжу [йэ́жжу].

3) Элемент [жд], характэрны для стараславянізмаў у рускай мове, у беларускай і ўкраінскай супадае ў адным гуку [дж]: рус. ро[жд]ение, хо[жд]ение, бел. нара[дж]энне, ха[дж]энне, укр. наро[дж]ення.

4) Спалучэнне [шч] ва ўкраінскай і беларускай мове вымаўляецца без змен: укр. [шч]ипати, [шч]ипци, бел. шчыпаць, шчыпцы, шчупак. У рускай мове тут варыянтнае вымаўленне: [шш’]ипат’, [шш’]ипцы, [ш’ч’]ипат, [ш’ч’]ипцы.

5) Старажытныя спалучэнні [дс], [тс], [кс], [чс] у сучаснай беларускай мове вымаўляюцца як [ц], а спалучэнні [зс], [сс] – як [с]: гара[ц]кі, саве[ц]кі, каўка[с]кі. У рускай мове большасць такіх спалучэнняў гукаў вымаўляюцца або як [цс]: горо[цс]кой, сове[цс]кій, або як [ч’с], [сс] і [с]: баранови[ч’с]кий, кавка[с]кий, ру[сс]кий.

6) У спалучэннях [нч], [нш], [ншч] ва ўкраінскай і у беларускай мовах гук [н] страціў ранейшую мяккасць: бел. ко[нч]ык, ме[нш]ы, рус.ко[н’ч’]ик, ме[н’ш’]е, укр. кі[нч]ик, ме[нш]е.

7) У сучаснай беларускай мове арфаграфічныя спалучэнні [кк], [кч] вымаўляюцца, як і пішуцца: *мяккі, змякчыць*, а зыходныя спалучэнни [гк], [гч] – як [хк], [хч]: лё[хк]а, дапама[хч]ы, стры[хч]ы. У рускай мове тут назіраецца варыянтнасць: ле[хк]о, лё[х’к’]ий.

8) Спалучэнне літар *дж, дз* у беларускай і ўкраінскай мовах могуць абазначаць адзін гук і вымаўляцца як афрыкаты [дз], [дж]: [дзвониек] – дзвоник; [присуджувати] – присуджувати; [в'ідр'адже"н':а] – відрядження; [нагородже"н':а] – нагородження. Вымаўленне гэтых гукаў асобна: [д] - [з], [д] - [ж] – з'яўляецца парушэннем арфаэпічных нормаў. Як два асобныя гукі яны вымаўляюцца тады, калі прыналежаць да розных частак слова, напрыклад да прыстаўкі і кораня: [в'ід-зиевати] – відзивати; [п'ід-зв'їтний] – підзвітний; [п'ід-жеину] – піджену.

9) Пярэднеязычныя [д], [т], [з], [с], [ц], [л], [н] перад наступнымі мяккімі зычнымі і перад [і] вымаўляюцца мякка: [майбут'н'е] – майбутнє; [п' іс'н'а] –пісня; [горд'іс'т'] – гордість.

17. Кожны, хто хоча бездакорна валодаць беларускай, украінскай і рускай літаратурнымі мовамі (нават адной з іх), павінен прытрымлівацца ў першую чаргу арфаэпічных норм. Як правіла, парушэнне норм вымаўлення адбываецца чатырма шляхамі.

Репозиторий ВГУ

Першы шлях парушэнняў арфаэпіі – гэта няцвёрдае засваенне агульнапрынятых норм вымаўлення, напрыклад, рэдукцыя галосных у беларускай мове, мяккае вымаўленне ўсіх шыпячых у рускай мове і інш.

Другі шлях – гэта ўплыў дыялектнай мовы на літаратурную.

Трэці шлях – гэта ўплыў арфаграфіі на вымаўленне: тэкст чытаецца абсалютна так, як ён напісаны, палітарна. Неабходна адзначыць, што пад уплывам напісання можа ўзнікнуць новы варыянт агульнапрынятай нормы.

Чацвёты шлях парушэнняў – гэта вынік узаемадзеяння суседніх ці роднасных моў. Людзі з нізкай маўленчай культурай, карыстаючыся адначасова і роднай, і рускай мовай, зблытваюць літаратурныя нормы ці гутарковыя варыянты арфаэпічных норм у абедзвюх мовах.

18. **Націск** ва ўкраінскай, беларускай і рускай мовах.

Ва ўсходнеславянскіх мовах, як і ў многіх іншых, націск – гэта адзін са сродкаў гукавой арганізацыі слоў і вуснага маўлення ў цэлым. Зразумела, асноўным сродкам гукавога афармлення і адрознення слоў з'яўляюцца самі галосныя і зычныя гукі. Аднак ад націску залежыць якасць гукаў, асабліва галосных. Націск – не толькі прымета асобнасці слова, але і спосаб выдзялення слова ў складзе маўленчага такта, фразы ўвогуле. Таму ў сучасным мовазнаўстве націск прынята разглядаць з трох бакоў: 1) як слоўны, 2) як тактавы, 3) як фразавы (лагічны, сэнсавы). У трох усходнеславянскіх мовах традыцыйна слоўны націск характарызуецца як сілавы, дынамічны, рознамясцовы. Гэта значыць, што націскны склад у беларускай, украінскай і рускай мовах выдзяляецца сілай, напружанасцю, інтэнсіўнасцю. Націск паказвае на спецыфічныя адрозненні моў паміж сабой. Так, можна адзначыць акцэнталагічныя адрозненні сучаснай беарускай мовы ад украінскай і рускай:

1) Ва ўкраінскіх і беларускіх словаформах націск у многіх выпадках на канцавых складах (апошнім і перадапошнім), а ў рускіх – пераважна на пачатковых (першым і другім): бел. *падáў, прыня́ў, абня́ў*, рус. *пóдал, при́нял, óбнял*, укр. *подáв, прийня́в, обня́в*.

2) Розны націск у некаторых беларускіх дзеясловах 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу: бел. *жывяцé, ідзяцé, стрыжацé*, рус. *живётe, идётe, стрижётe*, укр. *живéте, идéте*.

З прычын, што парадзілі ў агульнаўсходнеславянскіх словах і словаформах розны націск, можна назваць суседства іншых славянскіх моў, уласную сістэму словаўтварэння, распаўсюджанасць, сфера бытавання і інш.

19. У рускай мове націск можа пераходзіць на невытворныя прыназоўнікі, часціцы, злучнікі. Ва ўкрінскай і беларускай мовах невытворныя прыназоўнікі, злучнікі і часціцы не маюць у звязным вымаўленні ні слоўнага, ні лагічнага націску:

Руская мова	**Беларуская мова**	**Украінская мова**
Нá зиму, пóд гору, зá город	За руку́, на дзéнь, за гóрад	На нóг и, під руку́ , без вісті, на зи́му, на сміх

У агульных для абедзвюх моў націск падае ў асноўным на адзін і той жа склад. Разам з тым назіраецца і разыходжанне ў націску ў такіх словах, а таксама некаторых граматычных формах розных часцін мовы. Націскам могуць адрозніваца:

Репозиторий ВГУ

а) дзеясловы прошлага часу і інфінітывы:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
По́дал, при́нял, о́бнял, но звала́, дала́, гнала́; нести́, вести́	Прыня́ў, абня́ў, зва́ла, гна́ла; не́сці, ве́зці	Везла́, несла́, була́; нести́, везти́, ки́дати, кінча́ти, полежа́ти

б) дзеепрыметнікі прошлага часу:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
За́стланный, принесённый, приближённый, по́нятый, сушёный	Засла́ны, прыне́сены, наблі́жаны, наня́ты, су́шаны	За́сланий, набли́жений, суше́ний; на́йнятий

в) назоўнікі I скланненя В.скл., адз.л.:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Сте́ну, го́лову, во́ду, но́гу	Сцяну́, галаву́, ваду́, нагу́	Во́ду, но́гу, ру́ку

г) назоўнікі I і II скланенняў Н.скл., мн.л.:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Ко́лья, бра́тья, го́ловы, во́лосы	Калы́, браты́, гало́вы, валасы́	Коли́, брати́, го́лови, воло́сся

д) некаторыя лічэбнікі:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Оди́ннадцать, четы́рнадцать, восьмо́й	Адзіна́ццаць. Чатырна́ццаць, во́сьмы	Одина́дцять, чотирна́дцять, во́сьмий

е) некаторыя прыметнікі:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Ма́лый, ста́рый, тяжёлый, ху́денький, бли́зкий	Малы́, стары́, цяжкі́, ху́дзенькі, блі́зкі	Худе́нький, сті́йкий, близьки́й, маленький, тяжки́й

ж) прыслоўі:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
До́суха, вчера́, да́льше, слегка́, допозднá, светло́	Дасу́ха, учо́ра, далячэ́й, све́тла	Зле́гка, допі́зна, сві́тло, дале́ко, учо́ра

20. У рускай, беларускай і ўкраінскай мовах могуць выкарыстоўваца словы з варыянтным націскам:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Тво́рог – творо́г, и́наче – ина́че	Ваўка́ – во́ўка, навако́л - наво́кал	ві́втар – вівта́р, вла́дар – владар, до́чиста - дочиста́

21. Ва ўсходнеславянскіх мовах націск часта выкарыстоўваецца для адрознення слоў і іх форм. Словы і формы слоў, якія супадаюць па напісанні, але адрозніваюцца па вымаўленні, у т.л. і націскам, і значэннем, называюць <u>амографамі</u>:

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Бро́ня – броня́ , и́рис – ири́с, а́тлас – атла́с	Ка́са – каса́, ка́ра – кара́, ту́га – туга́	Бра́ти – брати́, при́клад – прикла́д, скла́ди – склади́

22. Агульная для трох усходнеславянскіх моў словы, якія адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску:

Репозиторий БГУ

Руская мова	Беларуская мова	Украінская мова
Босо́й, бежа́ть, борода́вка, ве́рба, веретено́, горо́шина, ольха́, о́тчим, уди́ть, у́зкий, доска́, дрова́, жи́вопись, зага́дка, зама́зка, ко́нчить, колесо́, колея́, коромы́сло, косо́й, креме́нь, крапи́ва, купе́ль, куря́тина, ку́хонный, ла́сковый, ле́топись, ма́ленький, ме́лкий, мозо́листый, мускули́стый, нажито́й, настоя́ть, не́нависть, низи́на, ни́зкий, ноздря́, но́вый, ну́дный, о́бруч, обстре́л, оле́нь, осо́ка, парали́ч, пе́репись, пе́рчить, петля́, по́дданный, подру́га, пока́з, полежа́ть, помолча́ть, пе́пельница, постоя́ть, потёмки, прия́знь, прия́тель, просто́р, пья́ница, решето́, ре́дкий, ре́зкий, разла́д, разма́х, распа́д, рукава́, ру́копись, ру́сло, серди́ть, середи́на, соло́мина, ска́терть, сла́бый, сороково́й, спина́, ста́рый, столя́р, сугли́нок, твёрдый, темно́, тигро́вый, толпи́ться, то́лстый, то́нкий, уроже́нец, усы́, фа́ртук, хвалёный, хлеста́ть, хло́потный, чёрствый, чи́стенький, широко́, шёлковый, щипцы́, юро́дивый, я́блоневый, я́сеневый.	Бо́сы, бе́гчы, баро́даўка, вярба́, верацяно́, гаро́шына, во́льха, айчы́м, вудзіць, вузкі, до́шка, дро́вы, жы́вапіс, зага́дка, зама́зка, ско́нчыць, ко́ла, каля́іна (каля́я), каро́мысел, ко́сы, крэ́мень, крапіва́, купе́ль, кура́ціна, кухо́нны, ласка́вы, ле́тапіс, мале́нькі, ме́лкі, мазо́лісты, му́скулісты, нажы́ты, настая́ць, няна́вісць, нізі́на, ні́зкі, но́здра, но́вы, ну́дны, абру́ч, абстрэ́л, але́нь, асака́, пара́ліч, пе́рапіс, пе́рчыць, пятля́, падда́ны, пака́з, паляжа́ць, памаўча́ць, по́пельніца, пастая́ць, по́цемкі, прыя́знасць, прыя́цель, прасто́р, п’я́ніца, рэ́шата, рэ́дкі, рэ́зкі, разла́д, разма́х, распа́д, рукавы́, ру́капіс, сярэ́дзіна, сало́міна, саракавы́, спі́на, стары́, сталя́р, суглі́нак, цвёрды, цёмны, ты́гравы, то́ўпіцца, то́ўсты, то́нкі, ураджэ́нец, ву́сы, фарту́х, хва́лены, хва́стаць, цыга́н, чэ́рпаць, клапо́тны, чэ́рствы, чы́сценькі, шыро́ка, шаўко́вы, шчыпцы́, юродзі́вы, я́блыневы, ясянёвы.	Бо́сий, бі́гти, боро́давка, верба́, верете́на, горо́ши́на, ві́лиха, вітчи́м, ву́дити, вузьки́й, до́шка, дро́ва, живо́пис, зага́дка, зама́зка, кінчи́ти, ко́лесо, ко́лія, коро́мисло, ко́сий, кре́мінь, кропива́, ку́піль, ку́рятина, кухо́нний, ласка́вий, лето́піс, мале́нький, мілки́й, мозоли́стий, мускули́стий, нажи́тий, настоя́ти, нена́висть, низина́, низьки́й, ні́здря, о́бстріл, о́лень, осока́, пара́ліч, пере́пис, перчи́ти, петля́, підданий, по́друга, по́каз, поле́жати, помо́вчати, попільни́ця, посто́яти, по́темки, при́язнь, при́ятель, про́стір, ре́шето, рідки́й, різки́й, ро́злад, ро́змах, ро́зпад, рука́ва (мн.л.), руко́пис, русло́, сере́дина, соломи́на, ска́терка, слаби́й, сороко́вий, спи́на, стари́й, сто́ляр, су́глинок, тверди́й, те́мно, ти́гровий, то́впитися, товсти́й, тонки́й, уро́дженець, ву́си, фарту́х, хва́лений, хльо́стати, клопітни́й, ци́ган, черпа́ти, че́рствий, чисте́нький, ши́роко, шоко́вий, щи́пци, юроди́вий, яблуне́вий, ясено́вий.

Пытанні для самаправеркі і самакантролю

1. Ахарактарызуйце рускія фанетычныя асаблівасці ў параўнанні з беларускімі.
2. Ахарактарызуйце ўкраінскія фанетычныя асаблівасці ў параўнанні з беларускімі.
3. Назавіце фанетычныя прыкметы запазычанняў у рускай, украінскай і беларускай мовах (стараславянізмаў, паланізмаў і інш.).
4. Назавіце агульныя фанетычныя працэсы беларускай і ўкраінскай моў.
5. Назавіце адрозненні фанетычнай сістэмы беларускай мовы ад рускай і ўкраінскай сістэм.
6. Ахарактарызуйце асаблівасці націску ва ўсходнеславянскіх мовах.

Репозиторий ВГУ

ТЭМА 4. Графіка-арфаграфічная сістэма ўсходнеславянскіх моў

Пытанні:

1. Узнікненне ўсходнеславянскага пісьма. Сучасныя ўсходнеславянскія алфавіты.
2. Арфаграфія. Прынцыпы рускай, беларускай, украінскай арфаграфіі.

Паняційны апарат: кірыліца, глаголіца, грамадзянка, графіка, графема, алфавіт, пісьмо, афраграфія, прынцыпы арфаграфіі.

Літаратура

1. Абабурка, М.В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў / М.В. Абабарука. – Мінск, 1992.
2. Бернштейн, С.Б. Сравнительная грамматика славянских языков / С.Б. Бернштейн. – Москва, 2005.
3. Бордович, А.М. Сопоставительный курс русского и белорусского языков / А.М. Бордович, А.А. Гируцкий, Л.В. Чернышева. – Минск, 1999.
4. Гурскі, М. І. Параўнальная граматыка рускай і беларускай моў / М.І. Гурскі. – Мінск, 1972.
5. Иванова, В.Ф. Современный русский язык: Графика и орфография / В.Ф. Иванова. – Москва, 1976.
6. Кайданова, А.И. Современная русская орфография / А.И. Кайданова, И.К. Калинина. – Москва, 1998.
7. Камароўскі, Я.М. Сучасная беларуская мова: Фанетыка і фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія / Я.М. Камароўскі, Л.І. Сямешка. – Мінск, 1985.
8. Правила русской орфографии и пунктуации. – Москва, 1956.
9. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск, 2008.
10. Сопоставительный анализ восточнославянских языков / Под ред. А.А. Лукашанца, А.М. Мезенко. – Минск, 2005.

1. Паходжанне і развіццё ўсходнеславянскай **графікі**. У аснову беларускай, рускай і ўкраінскай графікі пакладзены славянскі кірылаўскі алфавіт (кірыліца), які быў створаны на аснове грэчаска-візантыйскага пісьма ў другой палове IX ст. вучнямі славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія. У гэтым алфавіце было 43 літары: 24 запазычаны з грэчаскага пісьма, а для абазначэння гукаў, уласцівых славянскім мовам, было ўведзена яшчэ 19 літар. На ўсходнеславянскіх землях кірыліца пачала выкарыстоўвацца ў канцы IX ст. у сувязі з прыняццем хрысціянства і распаўсюджаннем кніг царкоўна-рэлігійнага зместу, напісаных кірыліцкім пісьмом. Да XVI ст. пісьмо было рукапісным.

Вялікую ролю ў развіцці кірыліцкага пісьма адыграла кнігадрукаванне, заснавальнікам якога ва ўсходніх славян стаў Францыск Скарына, які ў 1517 годзе выдаў у Празе першую беларускую друкаваную кнігу “Псалтыр”. На аснове кірыліцы беларускі першадрукар стварыў выразны шрыфт, у якім былі загалоўныя і радковыя літары і які стаў узорам для паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Шрыфт Францыска Скарыны плённа выкарыстоўваўся ўсімі ўсходнімі славянамі на працягу XVI-XVII ст.

Репозиторий ВГУ

У 1708 годзе загадам Пятра I была праведзена рэформа кірыліцкага пісьма, у выніку якой былі выключаны з алфавіта асобныя літары, спрошчаны абрысы літар, заменены іх назвы. Рэфармаваная кірыліца атрымала назву грамадзянскай азбукі (грамадзянкі), новыя абрысы літар якой у асноўным і захаваліся ў азбуках усходніх славян да нашага часу.

Усе літары ўсходнеславянскіх моў, размешчаныя ў пэўным парадку, складаюць алфавіт (рус. – алфавіт, азбука; укр. – алфавіт, азбука, абетка). Алфавіт (грэч. *alphabetos* – ад назваў першых дзвюх літар грэчаскага алфавіта *alpha* і *beta,* новагрэч. *vita*) – сукупнасць літар, размешчаных у агульнапрынятым парадку. У сучасных усходнеславянскіх мовах сукупнасць літар, размешчаных у зацаваным парадку, называецца яшчэ азбукай (ад першых літар кірыліцы *аз* і *букі*).

2. Украінская азбука сфарміравалася на аснове кірыліцы, якая была распаўсюджана ў Кіеўскай Русі пасля прыняцця хрысціянства і на працягу X-XVII стст. змянялася ў сувязі з неабходнасцю прыстасаваць яе да гукавога складу народнай гаворкі. У часы Кіеўскай Русі ўжываліся паралельна 2 азбукі: кірыліца і глаголіца. Старажытная ўкраінская азбука захавала ўсе літары старажытнай кірыліцы, але ў сувязі з развіццём фанетычнай сістэмы ўкраінскай мовы (падзенне рэдукаваных і абумоўленыя гэтым фанетычныя працэсы, пераход h ў і г.д.) расла неадпаведнасць паміж традыцыйна ўжывальнымі літарамі і новаўтворанымі гукамі, што прывяло ў стараўкраінскам пісьменстве да змешвання літар на пісьме (и ~ і ~ ы; h ~ е ~ и ~ і, ъ ~ ь) і разбурэння традыцыйнага правапісу. Гэты неўсталяваны правапіс на працягу XIII - пач. XVIII ст. стыхійна мяняўся ў кірунку яго ўзгаднення з гукавой сістэмай і граматычным ладам украінскай мовы. Пры адсутнасці адзіных норм правапісу і рэгулявання графікі гэтага дасягнуць не ўдалося. На развіццё ўкраінскай пісьменнасці і ўпарадкаванне ўкраінскага алфавіта мела ўплыў руская рэформа пісьма 1708-1710, паводле якой з алфавіта ліквідаваны як непатрэбныя літары *w*, ^ («от», «амега»), *j* («псі»), *k* («ксі»), *s* («зяло»), *y* («іжыца»), канчаткова ліквідаваныя @ («юс вялікі») і # («юс малы»), сталі выкарыстоўваць літару **е** замест ~ , узаконена спарадычна ўжывальная раней літара **я** замест > і г.д. У алфавіце, аднак, яшчэ заставаліся літары *f* («фіта»), h («яць»). Спрошчаны друкаваны шрыфт атрымаў назву «грамадзянская азбука» (грамадзянскі шрыфт). У XVIII ст. гэты шрыфт распаўсюдзіўся ва Усходняй Украіне, дзе яго прыстасоўваюць да гукавога складу ўкраінскай літаратурнай мовы.

На працягу XIX ст. было прапанавана ужыванне новых літар, якія захаваліся і ў сучаснай ўкраінскай азбуцы: **і** (А. Паўлоўскі, 1818), з'яўляецца (правапіс «Русалкі Днhстровои», 1837), **й** (правапіс паўд.-зах. аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства, 1873). У 2-й палове XIX ст. з грамадзянскай азбукі выпалі літары **ы, э, ъ,** за рознымі гукамі замацаваліся літары **и, і.** У Заходняй Украіне грамадзянскую азбуку ўпершыню выкарыстала «Руская сёмуха» ў зборніку «Русалка Днhстровая», з 70-х гг. 19 ст. ёй сталі карыстацца

Репозиторий ВГУ

«масквафілы» і інш. “Рускі правапіс” 1895г., выдадзены галіцкай Школьнай краёвай радай для ўжывання ў школьным навучанні, афіцыйна замацаваў грамадзянскі шрыфт і фанетычны правапіс у Галіччыне.

На Прыдняпроўі ўкраінская азбука і графіка сфарміраваліся ў іх сучасным выглядзе пасля 1905г., як паказаў «Слоўнік ўкраінскага мовы» пад рэд. Б. Грынчынка.

Згодна з правапісам 1933г. была выключана літара **ґ**, зноў адноўленая ў трэцім выданні “Украінскага правапісу” (1990г.).

3. Характарыстыка ўкраінскага алфавіта.

Сучасны ўкраінскі алфавіт складаецца з 33 літар, якія ўжываюцца для абазначэння на пісьме 48 фанем:

А а *(а)* Б б *(бэ)* В в *(вэ)* Г г *(гэ)* Ґ ґ *(ґэ)* Д д *(дэ)* Е е *(е)* Є є *(йэ)* Ж ж *(жэ)* З з *(зэ)* И и *(ы)* І і *(і)* Ї ї *(йи)* Й й *(йот)* К к *(ка)* Л л *(эл)* М м *(эм)* Н н *(эн)* О о *(о)* П п *(пэ)* Р р *(эр)* С с *(эс)* Т т *(тэ)* У у *(у)* Ф ф *(эф)* Х х *(ха)* Ц ц *(цэ)* Ч ч *(че)* Ш ш *(ша)* Щ щ *(ща)* Ь ь *(знак м’якшення)* Ю ю *(йу)* Я я *(йа)*

21 літара абазначае зычныя гукі: **б, у, г, ґ, д, ж, з, к, л, м, н, п, р, с, т, ф, х, ц, ч, ш, ш.** Літара **й** перад **о** абазначае зычны [j] *(його)*, а ў іншых пазіцыях – нескладовым галосным [і] *(йду, гай)*. Літара **г** абазначае звонкі гартанны фрыкатыўны зычны [ґ] (*голова*), а **ґ** – заднеязычны прарыўны зычны [g] *(ґава, ґрунт, ґудзик)*. Літара **щ** абазначае спалучэнне гукаў [шч] *(щука)*.

10 літар абазначаюць галосныя гукі, з якіх **а, е, и, і, о, у** перадаюць кожная па адным гуку, а літары **є, ю, я** абазначаюць па адным гуку толькі пасля мяккіх зычных (*синє, люди, ряд*), а ў пачатку слова, пасля галосных і пасля апострафа – па два ([j + e], [j + u], [j + a] – *має, юнак, в'янути*). Літара **ї** заўсёды абазначае два гукі ([j + i] – *їжа, з'їзд*). Літара **ь** гукавога значэння не мае, а ўжываецца для абазначэння мяккасці зычнага гуку (кінь, льон).

У сучасным ўкраінскім алфавіце няма літар для абазначэння гукаў [dz] і [dź], ётаванага **о** і нескладаўтваральнага галоснага [u] (як **ў** у беларускай мове), хоць гэтыя гукі выкарыстоўваюцца ў мове. Таму выкарыстанне спалучэнняў літар **дз, дж, ьо, йо** рэгламентуецца асобнымі нормамі правапісу, а літары **в** і **у** могуць абазначаць таксама “няпоўгалосныя” гукі, у залежнасці ад пазіцыі ў складзе. Літары ўкраінскага алфавіту па форме бываюць вялікія і малыя, а па разнавіднасці – друкаваныя і рукапісныя. Украінская азбука ў асноўным фанетычная, за выключэннем гукаў [дж], [дз], [u] і падоўжаных зычных [д'], [т'], [з'], [с'], [ц'], [л'], [н'], [ж'], [ч'], [ш'], якія не маюць асобных літар і складаных правілаў мяккасці або цвёрдасці зычных яе абумоўлівае наступны галосны.

Апостраф, які фармальна не ўваходзіць ва ўкраінскую азбуку, адлюстроўвае цвёрдасць гучання папярэдняга зычнага перад ётаванымі і з'яўляецца абавязковым да выкарыстання.

4. Характарыстыка беларускага алфавіта.

Сучасны беларускі алфавіт складаецца з 32 літар:

Аа *(а)* Бб *(бэ)* Вв *(вэ)* Гг *(гэ)* Дд *(дэ)* Ее *(е)* Ёё *(ё)* Жж *(жэ)* Зз *(зэ)* Іі *(і)* Йй *(і нескладовае)* Кк *(ка)* Лл *(эл)* Мм *(эм)* Нн *(эн)* Оо *(о)* Пп *(пэ)* Рр *(эр)* Сс *(эс)* Тт *(тэ)* Уу *(у)* Ўў *(у нескладовае)* Фф *(эф)* Хх *(ха)* Цц *(цэ)* Чч *(чэ)* Шш *(ша)* ы *(ы)* ь *(мяккі знак)* Ээ *(э)* Юю *(ю)* Яя *(я)*

Кожная літара выступае ў чатырох сваіх варыянтах – вялікая, малая, друкаваная, рукапісная. Назва кожнай літары (акрамя *й, ў, ь* і неётаваных

Репозиторий БГУ

галосных) – гэта склад з зычнага гука, абазначанага літарай, і галоснага э або *а*: *бэ, вэ, гэ, дэ, ка, эл, эм* і г.д. Беларускі алфавіт характарызуецца адсутнасцю дублетных літар; усе літары, пры адзінстве іх графічнай будовы, выразна адрозніваюцца паміж сабой. У ім ёсць літары, якія на пісьме могуць перадаваць спалучэнне гукаў, – ётаваныя галосныя (ё – [йо], е – [йэ], ю – [йу], я – [йа], а асобныя складаныя гукі [дж], [дз’] перадаюцца спалучэннем дзвюх літар (дыграфамі) – адпаведна **д** і **ж**, **д** і **з**. Адметнай рысай беларускага алфавіта з’яўляецца наяўнасць літары **ў** (у нескладовае) і літары **і**. У ім няма літар **щ** і **ъ**. Малюнак літар беларускага алфавіта просты, лёгка запамінаецца, у беларускіх літарах няма надрадковых знакаў (надрадковы знак ёсць толькі ў літар **ё**, **і**, **й**, **ў**), што зручна пры іх напісанні.

Парадак размяшчэння літар у беларускім алфавіце носіць умоўны характар і не стварае якой-небудзь строгай сістэмы. Калі першая літара абазначае галосны гук, то наступныя – групу зычных, пасля зноў паміж літарамі, якія абазначаюць зячныя гукі, знаходзяцца літары для абазначэння галосных, і ў канцы алфавіта – група літар, што абазначаюць галосныя гукі. Пэўная заканамернасць выяўляецца толькі ў размяшчэнні літар для абазначэння зычных гукаў: спачатку ідуць літары, якія абазначаюць звонкія зычныя гукі (б, г, д, ж, з), а затым літары, якія абазначыюуь глухія (к, п, с, т, ф, х, ц, ч, ш). Веданне паслядоўнасці размяшчэння літар у алфавіце мае важнае практычнае значэнне, таму што ў адпаведнасці з ёю складаюцца слоўнікі, розныя даведнікі, разнастайныя спісы.

5. Характарыстыка рускага алфавіта.

Сучасны рускі алфавіт складаецца з 33 літар. 10 з іх абазначаюць галосныя гукі, 21 – зычныя, дзве літары **ъ** і **ь** ніякіх гукаў не абазначаюць.

Аа *(а)* Бб *(бэ)* Вв *(вэ)* Гг *(гэ)* Дд *(дэ)* Ее *(е)* Ёё *(ё)* Жж *(жэ)* Зз *(зэ)* Ии *(и)* Йй *(и краткое)* Кк *(ка)* Лл *(эль)* Мм *(эм)* Нн *(эн)* Оо *(о)* Пп *(пэ)* Рр *(эр)* Сс *(эс)* Тт *(тэ)* Уу *(у)* Фф *(эф)* Хх *(ха)* Цц *(цэ)* Чч *(че)* Шш *(ша)* Щщ *(ща)* ъ *(твёрдый знак)* ы *(ы)* ь *(ь)* Ээ *(э)* Юю *(ю)* Яя *(я)*

Літары **я**, **е**, **ё**, **ю** абазначаюць спалучэнне гукаў [йа], [йэ], [йо], [йу] і называюцца ётаваныя галосныя.

6. Вышэй прыведзенае дазваляе нам вылучыць <u>агульныя рысы</u> ўсходнеславянскіх алфавітаў:

1) Кожная літара выступае ў 4 варыянтах – вялікая, малая, друкаваная, рукапісная;

2) Просты малюнак літар, лёгка запамінаюцца;

3) Наяўнасць ётаваных галосных;

4) Складовы або сілабічны прынцып графікі.

7. <u>Асаблівасці рускага алфавіта</u> ў параўнанні з іншымі ўсходнеславянскімі алфавітамі:

1) у рускім алфавіце адсутнічаюць літары: **Іі; ў; Її; Єє, Ґ ґ.**

2) адсутнічаюць дыграфы **Дж дж; Дз дз.**

3) Выкарыстанне **Ёё** з’яўляецца факультатыўным. Гэта літара ўжываецца: а) для папярэджання няправільнага чытання слоў, якія адрозніваюцца граматычна і сэнсам (*жёны – жены, мёл – мел*); б) для папярэджання няправільнага чытання слоў (*манёвр*); в) у пачатку запазычаных слоў можа выкарыстоўвацца замест літары **Ё** можа выкарыстоўвацца йо *(йод, йог);* в) у

Репозиторий ВГУ

якасці раздзяляльных знакаў выступаюць **Ъ** и **Ь**, але няма апострафа – (*объявление, подъём, семья*) і г.д.

Асаблівасці беларускага алфавіта:

1) З варыянтных абазначэнняў для галоснага гука [і] абраны **і** – *графіка, арфаграфія.*

2) Беларускі алфавіт мае ў сваім складзе літару **ў** (бел. – **у** нескладовае) – *заўважаць, пісаў, воўк.* У сучаснай моўнай практыцы выкарыстоўваецца толькі малая літара **ў**.

3) Раздзяляльную функцыю, якая адпавядае **ъ** і **ь** у рускай мове, у беларускай графіцы нясе апостраф: *сям'я, аб'ява, пад'ём, раз'юшаны.* Апостраф літарай не з'яўляецца і ў склад алфавіта не ўваходзіць.

4) У беларускай графіцы 2 дыграфы – **дж** і **дз**, якія абазначаюць адзіныя зычныя гукі [дж] і [дз] – *гляджу, асуджэнне, дождж, дзень, дзякуй* і г.д.

5) Літара **ё** ўжываецца ва ўсіх выпадках, калі неабходна пазначыць мяккасць папярэдняга зычнага перад [о] ці абазначыць спалучэнне гукаў [йо] – *сёстры, вёдры, мільён, стадыён* і г.д.

6) Замест рускай і ўкраінскай літары **щ**, якая ў беларускай мове адсутнічае, выкарыстоўваецца спалучэнне **шч**, якое абазначае два гукі [ш] і [ч] – *шчымлівы, яшчарка, яшчэ, шчаня* і г.д.

Асаблівасці ўкраінскага алфавіта:

1) Літары **ъ, ы, э** ва ўкраінскім алфавіце адсутнічаюць.

2) Няма літары **ё**, фукцыі якой перадаюць спалуэннем літар **ьо, йо** – *льон* (бел. лён), *йорж* (бел. ёрш) і г.д.

3) Літара **е** абазначае гук [э] – *ей, толерантність, конспектувати* і г.д.

4) Літара **ї** выкарыстоўваецца для перадачы ўкраінскага спалучэння [йі] – ***ї**жак, з' **ї**зд, кран**ї**а* і г.д.

5) Літара **є** ўжываецца для абазначэння [йє] або (што сустракаецца рэдка) – [э] пасля мяккага зычнага: *єдиний, фойє, ательє* і г.д.

6) Літара **и** абазначае гук [ы]: *риба (рус., бел. – рыба), син (рус., бел. – сын), крило (рус.,бел. – крыло).*

7) У якасці раздзяляльнага знака (як і ў беларускім алфавіце) можа выкарыстоўвацца апостраф – *м'яч, б'єш*.

8) Літарай **ґ** абазначаецца змычны гук [g] – *ґанак, ґудзик, аґруз, ґвалт* і г.д.

8. **Арфаграфія** (правапіс) усходнеславянскіх моў. Арфаграфія ўсходнеславянскіх моў грунтуецца на аднолькавых прынцыпах – *фанетычным* і *марфалагічным*, пры наяўнасці нязначнай колькасці *традыцыйных* і *дыферэнцыруючых* напісанняў, аднак ступень пашырэння гэтых прынцыпаў у рускай, беларускай і ўкраінскай арфаграфіі не аднолькавая.

Пры *фанетычным* прынцыпе прымаецца пад увагу рэальнае вымаўленне паасобных гукаў (або складоў) у слове, якія з'яўляюцца аб'ектам арфаграфічных правіл. Пры *марфалагічным* прынцыпе арфаграфічныя правілы вызначаюць нормы аднолькавага напісання адных і тых жа марфем, незалежна ад вымаўлення ўтвараючых іх гукаў у розных выпадках ужывання гэтай марфемы (за аснову звычайна бярэцца вымаўленне гукаў у моцнай пазіцыі – галосных пад націскам, зычных – перад галоснымі або санорнымі зычнымі). Так, пры фанетычным прынцыпе ў залежнасці ад вымаўлення пішацца *горы – гара*, пры марфалагічным жа

Репозиторий ВГУ

корань *гор-* перадаецца на пісьме аднолькава ва ўсіх выпадках яго ўжывання (*горы – гора*).

9. Асаблівасці арфаграфіі рускай мовы. У аснову рускай арфаграфіі пакладзены марфалагічны прынцып, на якім грунтуюцца, за нязначнымі адхіленнямі, правілы правапісу галосных і зычных у коранях, прыстаўках і суфіксах усіх часцін мовы. Так, у корані *берег* захоўваецца напісанне літары **е** ва ўсіх словах, утвораных ад гэтага кораня (*берега*, *бережок*, *набережная*, *береговой*); прыстаўка **под-** пішацца аднолькава ва ўсіх словах, у склад якіх яна ўваходзіць (*под-пись*, *под-писать*, *под-бежать*, *под-нимать*); суфікс **-ост(ь)** захоўвае ў напісанні літару **т** незалежна ад вымаўлення (*рад-ость – рад-ост-н-ный, слад-ость – слад-ост-н-ный*).

Большасць марфалагічных напісаняў правяраецца супастаўленнем з іншымі формамі слова або словамі, дзе ёсць адпаведная марфема, у якой напісанне адпавядае вымаўленню патрэбнага галоснага або зычнага: *золото́й – зо́лото – позоло́та*, напісанне канчатка **-о** ў слове *золото* можна праверыць супастаўленнем з іншым назоўнікам таго ж скланення ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку (*долото́*); напісанне галосных у прыстаўцы **пере-** ў слове *перевал* – супастаўленнем з *пе́рекись*, *пере́бранный*. Аднак шэраг напісанняў марфалагічнага характару з'яўляецца бесправерачным, напрыклад напісанне выдзеленых літар у словах ***со***ловей, ***о***вёс, м***и***зинец, к***о***рова. Часта напісанне пэўных марфем поўнасцю супадае з іх вымаўленнем (*сом, сам, дом, том, шум, дум*), і ўсё ж такія напісанні трэба лічыць марфалагічнымі, таму што тут мы маем справу з пастаянна аднолькавым абазначэннем на пісьме гэтых марфем. У некаторых выпадках аднолькавыя марфемы пішуцца ў пэўных варыянтах, у адпаведнасці з гістарычным чаргаваннямі гукаў, якія адбыліся ў такіх марфемах: *ход-ить – хож-у*, *пис-ать – пиш-у*, *стриг-у – стриж-ёшь*, *бр-ать – бер-у – со-бир-аю*, *сел-о – сёла*, *шепт-ать – шёпот*. Хоць такія напісанні і парушаюць у пэўнай ступені марфалагічны прынцып, аднак яны не з'яўляюцца фанетычнымі, таму што не абумоўлены пазіцыйнымі чаргаваннямі, якія дзейнічаюць у сучаснай рускай мове.

Правілы, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, займаюць у рускай арфаграфіі зусім нязначнае месца. Сюды адносяцца правапіс зычных у канцы прыставак **из-, воз- (вз-), без-, низ-, чрез- (через-), раз-**: *избирать – испытать*, *возражать – воспитать*, *взбираться – вспыхнуть*, *безразлично – бесконечно*, *чрезвычайный – чересполосный* і напісанне прыстаўкі **раз- (рас-)** або **роз- (рос-)** з літарай **а** ці **о** ў залежнасці ад націску (*расписка – роспись*). У адпаведнасці з вымаўленнем галоснага **и** як **ы** пасля зычных прыстаўкі пішацца: *сыграть*, *взыскать*, *безынтересный*, *безыдейный*. У адпаведнасці з вымаўленнем замацаваліся напісанні *здесь* (*з сьдесь*), *затхлый* (корань *дъх → дх*), *где* (*з къдь → кде*), *свадьба* (корань *сват*), *лестница* (корань *лез*), *ноздря* (корань *нос*), *малявка* (параўн. *моль*), *махровый* (параўн. *мохры*).

Да традыцыйных адносяцца напісанні, якія не адпавядаюць сучаснаму вымаўленню і не могуць быць растлумачаны, зыходзячы з прынцыпу марфалагічнага (шляхам супастаўлення з перадачай на пісьме галосных або зычных дадзенай марфемы ў моцнай пазіцыі). Такія напісанні ў мінулым маглі быць фанетычнымі, цяпер жа яны захоўваюцца па традыцыі, хоць гукавое афармленне слова і змянілася, а напісанне як было ўстаноўлена ў

Репозиторий ВГУ

мінулым, так і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Напрыклад, да традыцыйных можна аднесці напісанне ў рускай мове літары **ь** пасля шыпячых **ж, ш** у форме другой асобы адзіночнага ліку дзеясловаў цяперашняга часу (*везёшь, несёшь*), у прыслоўях (*настежь, сплошь*), дзе гэтай літарй не абазначаецца мяккасць зычных **ж, ш** (параўн. бел. *вязеш, нясеш, насцеж*; укр. *везеш, несеш, навстіж*, дзе **ь** не пішацца). У форме загаднага ладу (*режь, ешь, отсрочь*) літара **ь**, якая пасля іншых зычных паказвае ў гэтай форме на мяккасць (*ставь, сыпь, сядь*, але: *ляг*), стала паказчыкам граматычнай формы дзеяслова. Тое ж можна сказать і аб напісанні з **ь** назоўнікаў трэцяга скланення (*ночь, рожь, мышь*), дзе **ь** паказвае на граматычны род назоўнікаў (параўн. *врач, сторож, малыш*). Традыцыйным з'яўляецца напісанне выдзеленых літар у словах *с***о***бака, торм***о***з, в***о***кзал, ст***е***нок.*

Дыферэнцыруючыя напісанні, па якіх адрозніваюцца значэнні слоў-амонімаў, займаюць нязначнае месца ў рускай арфаграфіі: *компания – кампания, ожог* (назоўнік) – *ожёг* (дзеяслоў), *орёл* (птушка) – *Орёл* (горад), *бал* (танцавальны вечар) – *балл* (адзнака), *по* (прыназоўнік) – *По* (рака) і інш.

Пры напісанні іншамоўных слоў часта захоўваюцца арфаграфічныя асаблівасці той мовы, з якой слова запазычана, хоць такое напісанне і не адпавядае рускаму вымаўленню; напрыклад, *металл, грамматика, барраж, баррикада, ассистент, комиссия* пішуцца з павойнымі зычнымі.

10. Асаблівасці арфаграфіі беларускай мовы. У беларускай арфаграфіі прынцыпы фанетычны і марфалагічны з'яўляюцца раўнапраўнымі. Першы пашыраецца галоўным чынам на правапіс галосных, а другі – на правапіс зычных. Аднак такое размежаванне сфер прымянення гэтых прынцыпаў праведзена ў беларускім правапісе непаслядоўна.

У адпаведнасці з фанетычным прынцыпам пішуцца галосныя каранёў слоў, прыставак, суфіксаў і з пэўнымі абмежаваннямі, звязанымі з неабходнасцю дыферэнцыраваць граматычныя формы слова, а таксама ў канчатках. У прыватнасці, у адпаведнасці з аканнем і яканнем ненаціскныя **о, э** на пісьме перадаюцца праз **а;** у першым складзе перад націскам **е** перадаецца праз **я**; пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных у адпаведнасці з вымаўленнем пішацца **ы**, пасля мяккіх – **і**. Пэўныя адценні, якія ўзнікаюць у вымаўленні галосных фанем / о /, / а /, / э (е) /, / і /, / ы / ў іншых пазіцыях, і адценні фанемы / у / на пісьме не перадаюцца, што сведчыць аб няпоўнай адпаведнасці паміж напісанем і вымаўленнем галосных у беларускай мове (напісанне літары **е** ў паслянаціскных складах і ў пераднаціскных (апрача першага склада перад націскам, дзе пішацца **я**) з'яўляецца пэўным адхіленнем у бок марфалагічнага прынцыпу). Напрыклад: *го́ры – гара́, го́рад – гаро́дзіш – гарадо́к, лес – ля́сны – лесаві́к, шэ́пча – шапта́ць – шапацéць, абрэ́заць – абраза́ць, вéсела – вясёлы – весялéй, шыр – шыро́кі, лы́сы – лысéць – лысава́ты, ці́хі – ці́шэйны – ці́хава́ты, дуб – дубы́ – дубянéць, лю́дзі – людзéй – лю́дскасць; бéзліч – бязлі́кі – бездако́рны, ро́спіс – распі́ска – распіса́цца; дубо́к – арэ́шак, весяло́сць – ра́дасць, кляно́вы – арэ́хавы; рако́ю – рэ́чкаю, садо́ў – арэ́хаў, маладо́й – до́брай, бярэ́ш – пячэ́ш – рэ́жаш – пі́шаш.*

Марфалагічнымі з'яўляюцца, напрыклад, напісанні выдзеленых галосных у канчатках назоўнікаў *зелл***е** – *зелл***я**, *насенн***е** – *насенн***я**,

Репозиторий ВГУ

прыметнікаў *сіня***я** – *сіня***е**, *добра***я** – *добра***е**, дзеясловаў *спява***е**, *чыта***е**, літары **е** ў прыназоўніку **без,** часціцы **не**, галосных **э, е** не пад націскам у іншамоўных словах: *тэлевізар, тэатр, эстафета, этаж, экзамен, атэлье, дырэктыва, прэпарат, рэвалюцыя, рэканструкцыя, дэтэктар, дэканат*.

Зычныя, за пэўнымі выключэннямі, пішуцца ў адпаведнасці з марфалагічным прынцыпам, у прыватнасці: звонкія на канцы слова і перад глухімі зычнымі, глухія перад звонкімі (марфалагічнымі трэба прызнаць і напісанні зычных перад галоснымі і санорнымі (апрача прыстаўкі **з- (с-)** перад санорнымі): *дам – там, злы – слых, дрыгва – трава*), у тым ліку і большасць спалучэнняў зычных на стыку марфем: *хлеб, рад, сказ, нож, сядзь, рыб-к-а, салод-к-і, пры-каз-к-а, нож-к-а, прось-б-а, груз-чык, пад-пісчык, пераклад-чык, лёт-чык, купаеш-ся, ад-важыць, ад-пусціць, аб-віць, аб-сыпаць, падд-біць, пад-сеяць.*

Выключэнне складаюць: напісанне зычнага **з** або **с** згодна з вымаўленнем у канцы прыставак **раз-, без- (бяз-), праз-, цераз-, уз-** перад звонкімі або глухімі зычнымі, як і ў адпаведных прыстаўках у рускай мове (*разбіць – распытаць, бязводны – бяскроўны, узбегчы – успыхнуць*), прыстаўкі **з** або **с** (*збіць – спытаць*), спалучэнняў **т, с, ж, ш, х, ч з** суфіксальным **с** (*савецкі, салдацкі*, але: *гарадскі, грамадскі; рускі, беларускі*, але: *каўказскі, французскі, казахскі; птах – птаства, таварыш – таварыства, таварыскі*, але: *нарвежскі, чэшскі* – у прыметніках, утвораных ад геаграфічных назваў; *ткач – ткацкі*); напісанне **-цца** ў дзеясловах на месцы **-ться (-тся)** (*насі́цца, вучы́цца, но́сіцца, ву́чыцца*); адсутнасць у напісанні невымаўляемых зычных (*радасць – радасны, чэсць – чэсны, сардэчны – сэрца*). Такім чынам, марфалагічны прынцып у адносінах да правіл напісання спалучэнняў зычных, як і фанетычны ў адносінах да галосных, праведзены ў беларускай арфаграфіі непаслядоўна, а часам фанетычны і марфалагічныя напісанні пераплятаюцца: *гарадскі – салдацкі, французкі – рускі, таварыскі – чэшскі.*

<u>Дыферэнцыруючыя</u> напісанні ў беларускай арфаграфіі, як і ў рускай, займаюць нязначнае месца (*Арол – арол, Залессе – залессе, Заціша – заціша*); яны звязаны з адрозненнем уласных і агульных імёнаў.

Відавочна, што арфаграфічныя адрозненні сучаснай беларускай мовы ад рускай можна бачыць найперш у перадачы на пісьме акання (якання), што з'яўляецца спецыфічнай рысай і беларускай фанетыкі, і беларускай арфаэпіі, і беларускай арфаграфіі (параўн. бел. *год – гадавы, поле – палявы* і рус. *год – годовой, поле – полевой* і інш.). Руска-іншамоўныя спалучэнні *ио, ыо* па-беларуску перадаюцца ў залежнасці ад націску і з ётацыяй апошніх галосных, г.зн. пад націскам пішацца *іё, ыё*, а не пад націскам – *ія, ыя*: *біёлаг – біялогія, патрыёт – патрыятызм* (параўн.: *биолог – биология, патриот – патриотизм*). Спалучэнне *ст, стл, здн, рдц, лнц* у беларускай арфаграфіі поўнасцю падпарадкаваныя фанетычнаму прынцыпу: параўн. бел. *радасны* і *радасць*, *шчаслівы* і *шчасце*, *сэрца* і *сардэчны*, *сонца* і *слачнечнік* з рус. *радостный* і *радость*, *счастливый* і *счастье*, *сердце* і *сердечный*, *солнце* і *подсолнух*. Прыстаўка *з- (с-)* у беларускай мове падпарадкавана асіміляцыі па глухасці-звонкасці і на пісьме, а па-руску яна пішацца толькі ў адным варыянце: бел. *здаць*, *сказаць* і рус. *сдать*, *сказать*. Па-беларуску інфінітыў і 3-ая асоба дзеясловаў адзіночнага ліку з

Репозиторий ВГУ

постфіксам -*ся* пішуцца так, як вымаўляюцца і чуюцца; у рускай мове напісанне значна разыходзіцца вымаўленнем: бел. *дабівацца* і *дабіваецца*, *старацца* і *стараецца*, *мыцца* і *мыецца*, рус. *добиваться* і *добивается*, *стараться* і *старается*, *мыться* і *моется*. У беларусаў на фанетычным прынцыпе грунтуюцца і напісанні многіх прыметнікаў з суфіксам -*ск*-, асабліва калі яны ўтвораны ад назоўнікаў з асновай на *т*, *к*, *с*, *ш* і не абазначаюць геаграфічных назваў: *савецкі* (рус. *советский*), *студэнцкі* (*студенческий*), *дзівацкі* (*чудаческий*), *беларускі* (*белорусский*), *таварыскі* (*товарищеский*) і г.д.

У адрозненне ад беларускай арфаграфіі сучасная руская арфаграфія пабудавана пераважна на марфалагічным прынцыпе, які вельмі часта пераплятаецца з традыцыйным (параўн. напісанне з вымаўленнем спалучэнняў *оло*, *оро*, *здн*, *рдц*, *стл* і інш., галосных пасля шыпячых, падвоеных зычных і інш.). Калі функцыя мяккага знака раздзяляць зычныя і ётаваныя галосныя ў рускай мове значна пашырана, то ў беларускай мове такая функцыя *ь* зусім абмежавана словаформамі тыпу *лье*, *Ілья*, *Ільінічна* і г.д. У беларускай гутарковай мове, а пад яе ўплывам і ў мове мастацкай літаратуры часта ўжываюцца імёны і імёны па бацьку тыпу *Ілля*, *Ілліч*, *Васілевіч*, *Аркадзевіч*, *Лявонцевіч*, *Ананевіч* і іншыя, напісанне якіх паводле вымаўлення пашыраецца ў моўнай практыцы апошняга дзесяцігоддзя.

Шматлікія арфаграфічныя адрозненні ў абедзвюх мовах узніклі са спецыфікай беларускай і рускай моў у лексіцы, слова- і формаўтварэнні, у функцыяніраванні розных часцін мовы. Напрыклад, рус. *по нраву* пішацца толькі ў два словы, беларусы разназначнае паняцце перадаюць двума спосабамі: *да спадобы* і *даспадобы*; рускаму складанаму слову *нравоучение* адпавядаюць простыя беларускія *павучаннне*, *навучанне* і запазычаныя *мараль*, *натацыя*; бел. *хтосьці* і *абы-хто* маюць рускія адпаведнікі зусім іншай структуры: *кто-то*, *кто-нибудь*, *кто-либо*, *лишь бы кто*, *кто угодно*; неадпаведнасць у родзе і ліку шматлікіх слоў прыводзіць да неадпаведнасцей як у вымаўленні, так і напісанні: бел. *капыт*, *россып*, *дзверы* і рус. *копыто*, *россыпь*, *дверь* (пры змяненні такіх слоў колькасць неадпаведнасцей павялічваецца: параўн. бел. Р. *россыпу*, Т. *россыпам*, М. *аб россыпе* і рус. *россыпи*, Т. *россыпью*, П. *о россыпи*); адрозненне канцавых гукаў той ці іншай асновы выклікае розніцу ў канчатках ці ў перадачы на пісьме саміх гукавых змен пры скланенні ці спражэнні: бел. *ноччу*, *Свір'ю*, *пяццюдзесяццю*, *разводдзем* і рус. *ночью*, *Свирью*, *пятьюдесятью*, *половодьем* і г.д.; бел. *гавару*, *пішу*, *гаворыш*, *пішаш*, *гаворыць*, *піша* і рус. *говорю*, *пишу*, *говоришь*, *пишешь*, *говорит*, *пишет* і г. д. Традыцыйныя, або гістарычныя, і дыферэнцыйныя, або сімвалічныя, напісанні пераважна супадаюць у абедзвюх мовах на сучасным этапе іх развіцця. Аднак, як ужо адзначалася, у рускай арфаграфіі традыцыі кірылічнага пісьма вельмі жывучыя як пры перадачы галосных і іх спалучэнняў, так і пры перадачы зычных і іх спалучэнняў.

11. <u>Прынцыпы арфаграфіі ўкраінскай мовы</u>. Украінскі правапіс, як і беларускі, заснаваны на двух прынцыпах – *фанетычным* і *марфалагічным*; галоўнае адрозненне ўкраінскіх напісанняў ад беларускіх звязана з адсутнасцю акання ва ўкраінскай мове і з іншымі фанетычнымі асаблівасцямі гэтай мовы, а таксама з асаблівасцямі яе графікі.

Репозиторий ВГУ

Фанетычнымі ва ўкраінскай арфаграфіі з'яўляюцца, напрыклад, напісанні літары **і** на месцы старажытнага **о, е** ў новых закрытых складах (*літо, міра, після, прізвище, піч*), літары **а** ў некаторых словах на месцы этымалагічнага **о** (*хазяін, багатий, вимагати, ламати*), прыстаўкі **с** перад глухімі зычнымі і **з** – перад звонкімі і санорнымі (*сказати, спитати, сходити,* але: *збавляти, зварити, злити, зносити, змерзнути*), спалучэнняў **-ств-, -зтв-, -цтв-, -ськ-, -зьк-, -цьк-** на стыку суфіксаў з папярэдняй марфемай (*товариство, птаство, мистецтво, миський, руський, чеський, криворізький*), неабазначэнне на пісьме невымаўляемых зычных у спалучэннях **-стн-, -здн-, -рдц-, -лнц-** (*радісний, пізній, серце, сонце*).

На марфалагічным прынцыпе грунтуецца напісанне галосных (апрача адзначаных выпадкаў напісання **і**) у розных пазіцыях, незалежна ад вымаўлення ў сувязі з пазіцыйнымі чаргаваннямі (*весна, тепліший, превеликий, голубка*), напісанне глухіх зычных перад звонкімі (*просьба, молотьба*), зычных на канцы прыставак (*безсильний, безцінний, відзив, відправляти, надсилати, надтесати, передплата, передсердя, підпірка, розкачка, розписка*), спалучэнняў **-шся, -ться** ў дзеясловах (*радуєшся, радується*).

Пытанні для самаправеркі і самакантролю

1. Прыгадайце аўтарства і паходжанне славянскага алфавіта. Які алфавіт ляжыць у аснове ўсходнеславянскай графікі? Які алфавіт называецца "грамадзянкай"?
2. Ахарактарызуйце асаблівасці беларускага алфавіта ў параўнанні з рускім.
3. Ахарактарызуйце асаблівасці ўкраінскага алфавіта ў параўнанні з беларускім.
4. Ахарактарызуйце асаблівасці рускага алфавіта ў параўнанні з украінскім.
5. Параўнайце старажытны кірылічны алфавіт і сучасныя ўсходнеславянскія алфавіты. Назавіце агульнае і адрознае.
6. Якія прынцыпы арфаграфіі характэрныя для агульнаўсходнеславянскага перыяду? Для перыяду станаўлення нацыянальных моў усходніх славян?
7. Назавіце сучасныя прынцыпы арфаграфіі рускай, беларускай і ўкраінскай моў. Прывядзіце прыклады напісанняў.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Жлуктенко, Ю.А. Изучаем украинский язык: Самоучитель / Ю.А.Жлуктенко, Е.А.Карпиловская, В.И.Ярмак; под ред. В.М.Русановского. – 4-е изд., испр. и доп. – М.: “Муравей”, 2004.
2. Журавлев, В.К. Развитие группового сингармонизма в праславянском языке / В.К. Журавлев. – Минск, 1963.
3. Кондрашов, Н.А. Славянские языки / Н.А. Кондрашов. – Москва, 1962.
4. Метлюк, А.А. Взаимодействие просодических систем в речи билингва / А.А. Метлюк. – Минск, 1986.
5. Нахтигал, Р. Славянские языки / Р.Нахтигал. – Москва, 1963.
6. Очерки по сравнительной грамматике восточнославянских языков. – Одесса, 1958.
7. Русский язык в Белоруссии. – Минск, 1985.
8. Русско-белорусские языковые связи. – Минск, 1976.
9. Языки мира: Славянские языки. – Москва, 2005.
10. Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў. – Мінск, 1982.
11. Рагойша, В.П. Проблемы перевода с близкородственных языков / В.П. Рагойша. – Мінск, 1980.
12. Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси. – Минск, 1999.
13. Функционирование русского языка в близкородственном окружении. – Киев, 1981.
14. Шидловский, А.В. Лингвистические проблемы перевода на белорусский язык / А.В. Шидловский. – Минск, 1978.
15. Белорусско-русские языковые отношения: контакты, двуязычие, методика обучения. – Вып. 10. – Минск, 1990.

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

ЗІМАНСКІ Вадзім Элдаравіч

ПАРАЎНАЛЬНАЯ ГРАМАТЫКА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ МОЎ

Курс лекцый

У 2 частках

Частка 1

Уводзіны. Лексіка. Фразеалогія. Фанетыка. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Графіка. Арфаграфія

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп'ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк 30.09.2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.

Ум. друк. арк. 3,20. Ул.-выд. арк. 3,61. Тыраж 85 экз. Заказ 158.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі

«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».

ЛВ № 02330/110 ад 30.01.2013.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі

«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».

210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ